Новы Час | 27 чэрвеня 2020 | № 24 (683) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №6

Літаратурная Беларусь

Выпуск №6 (166)
(чэрвень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб’яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Беларускія анёлы

Адам ГЛОБУС

Цукровая пудра

Хочаш пабачыць анёла?
Няўжо і сапраўды табе закарцела
ўбачыць свайго анёла?
Добра-добра, не стану спрачацца,
бо не змагу табе паказаць яго...
Ілгуць. Усе, хто кажа адваротнае — хлусяць.
Не магу я табе паказаць анёла.
Але тое-сёе я ўсё ж магу і зраблю...
Увечары ты будзеш спяваць,
станеш спяваць адну песню за адной,
будзеш спяваць, пакуль не дойдзеш да забытых слоў.
Так здараецца, палову слоў памятаеш,
а другая палова некуды правалілася.
Намагаешся ўспомніць і не можаш...
Ты разбярэш ложак, сядзеш на яго,
а перад тым, як легчы,
насыплеш на падлогу цукровай пудры.
Ляжаш, заплюшчыш вочы
і паспрабуеш згадаць
словы з напалову забытай песні.
Анёл прыйдзе табе дапамагчы,
абавязкова прыйдзе.
Успомняцца забытыя словы,
і ты заснеш шчаслівым.
Раніцай ты пабачыш
на белай пудры
анёльскія сляды...

Цыгарэта

Павел курыць толькі чужыя цыгарэты.
Ён працуе ў кнігарні,
калі моцна захочацца закурыць,
Павел выходзіць на ганак
і просіць у каго з курцоў адну цыгарэту.
Частуюць...
Сёння было халодна, ішоў снег.
Павел выйшаў на ганак без шапкі,
выйшаў у адной кашулі,
моцна хацелася закурыць,
але ўсе, хто стаяў каля кнігарні,
даўно кінулі курыць,
і нават зрэдку яны не пакурвалі
чужыя цыгарэты.
Павел стаяў пад снегам, без шапкі,
у адной кашулі.
Чакаў, пакуль нехта з курцоў не падыдзе.
Лёс быў лагодным да Паўла;
да кнігарні падышоў анёл у сінім хітоне.
Ён курыў слабыя жаночыя цыгарэты.
Ён і пачаставаў Паўла такой нямоцнай,
але такой жаданай і такой своечасовай
цыгарэтай.
Дзеля гэтага анёлы і прыходзяць,
каб дапамагчы табе ў цяжкую і халодную хвіліну.

Ахоўнік

Ты ўмееш зазіраць у будучыню.
Робіш мала памылак,
бо ведаеш, што чакае наперадзе і
што нам прынясе дзень заўтрашні.
Для цябе не сакрэт –
які сабака пачне брахаць,
а які кінецца, каб пакусаць.
Не таямніца — які мядзведзь вырвецца з клеткі,



Малюнак аўтара

а які застанецца раўсці за сталёвымі прутамі.
Ты — не анёл, але шмат што можаш,
каб абараніць сваю жанчыну.
Ты ж ведаеш, якое пытанне задасць
хітрадушная
журналістка-падманшчыца,
а якое пачуеш ад следчага з аддзела
па барацьбе з фінасавымі злачынствамі.
Ты — ахоўнік, ты ясна бачыш будучыню
і можаш прагнаць рудахвостую лісу,
якая пачала рыць падземны ход
у хлявушок з курамі і пеўнямі.

Маршы

Анёл любіць пасвістваць
так, як пасвіствае звычайны хлопчык.
Анёл можа высвістаць ажно цэлую песню.
Калі ты пачуеш тую песню і запомніш яе,
дык у цябе можа атрымацца хіт.
Кажу без перабольшванняў.
З такім хітом можна стаць вядомым
аўтарам адной песні.
Некаму шанцуе, і ён чуе пасвістванне анёла
не адзін раз, а некалькі разоў узапар.
Такі слухач можа назбіраць сабе
выдатных мелодый на цэлы альбом.
Той, хто чуе пасвістванне анёла ўвесь час,
ходзіць у геніях па музычным свеце —
піша музыку для кіно і атрымлівае
замовы на оперы.
Трэба сказаць:
вайсковыя маршы і вясельныя вальсы
анёл чамусьці ніколі не насвіствае...
Жалобны марш і рэквіем
кампазітар, таксама, піша без анёла.

Лекі

Анёл можа вылекаваць цябе,
можа лёгка выратаваць ад любой,
нават самай цяжкай і страшнай хваробы.
Сябе анёл вылекаваць не можа,
а цябе — лёгка...
Ён ле́кує без аптэчных пігулак,
без міксутры, без мазяў і бальзамаў.
Ён узмахвае крыламі і змятае хваробу,
як цыгарэтны попел з барнага стала...
Каб цябе вылекаваць і ўратаваць,
яму не патрэбны панарамны здымак сківіцы,
і не трэба сканаваць твой ператомлены мозг.
На флюраграфію анёл цябе не пашле, дакладна.
Ён узмахне вялікімі крыламі,
лёгкі ветрык абаўе цябе з ног да галавы,
і паляціць у неба, зносячы ў незварот хваробу...
Анёл, праўда, можа цябе вылекаваць;
але ты не можаш запісацца да яго на прыём,
не можаш яго выклікаць і не можаш яго знайсці.
Ён можа з’явіцца і дапамагчы, а можа і не з’явіцца.
Так што табе ў цяжкі момант жыцця
давядзецца пайсці да простага доктара...

Давер

Аднакрыламу анёлу давяраеш болей,
чым анёлу з двума крыламі...
Не стану казаць, што двухкрыламу нельга давяраць,
ці тое, што двухкрылы абавязкова падмане.
Зусім і не абавязкова, што ён будзе
падманваць...
Але, калі ўсё ж анёлы цябе падмануць
і паспрабуюць як найхутчэй уцячы,
дык аднакрылы будзе ўцякаць не так хутка,
як ягоны двухкрылы субрат.
Яшчэ — добра, калі ў аднакрылага анёла
крыло цёплага ружова-чырванаватага колеру.
Такое вогненнааблічнае крыло відаць здалёк.
Пад такім крылом значна спакайней і цяплей,
чым пад крылом чорным ці нават пад крылом белым.

Малако

Анёл выйшаў з самалёта,
каб выпіць воблачнага малака...
Без высотнага малака
ён хварэе на вяласць і ватнасць.
Сам мне расказаў пра хваробы.
Раней анёл на ўласных крылах
лёгка ўздымаўся да самых аблокаў.
Уздымаўся на дзесяць кіламетраў,
а часам нават вышэй і значна вышэй.
Цяпер анёл разленаваўся,
купляе звычайны (эканомклас) квіток на самалёт,
узлятае і ляціць, як самы будзёны авіяпасажыр,
потым — выходзіць да аблокаў праз борт.
Анёл здатны праходзіць скрозь сцены,
нават праз жалезабетонныя і праз металічныя.
Анёл выйшаў з самалёта,
калі сцюардэсы пачалі разносіць гарачы сняданак –
амлет з круглай булачкай і гарбату з лімонам.
Анёл выйшаў над крухмальнымі Альпамі.
На ўспамін пра нашу сустрэчу
анёл пакінуў візітоўку без літар і без лічбаў,
ідэальна белую, ідэальна чыстую.

Успаміны эсбээмаўкі

Альжбета КЕДА

Алена Паўлаўна Новік, дзявочае прозвішча Грыцкевіч, з вёскі Воўца, што недалёка ад майго Шчонава... Жыве ў Любчы, куды пераехала з сям'ёю ў 1963 годзе. Сямнаццаць гадоў адпрацавала медсястрою ў Райцаўскім шпіталі.

З гэтай незвычайнай асобай пазнаёмілася, калі яна ўжо мела дзевяноста чатыры гады. Светлая, жыццярадасная, разумная, памяць захавала незвычайную. Многія едуць да яе, каб паслухаць. Падаю тут некаторыя згадкі дарагой мне эсбээмаўкі.

Усё жыццё вучылася!

Калі ўпершыню пачула Алену Паўлаўну, была здзіўлена прыгожаю, літаратурнаю беларускаю гаворкаю. Расказала яна, дзе вучылася, адкуль яе дасканалая мова.

Пры Польшчы Алена Грыцкевічава, адзіная дачка ў бацькоў, паспела скончыць шэсць класаў. У 39-ым, пры Саветах, назад у пяты адсадзілі. Дайшла да сёмага — зноў пераварот, вайна. Зноў у сёмы адсадзілі. Спачатку вучылася ў Карэлічах, закончыла сем класаў. А тут у Наваградку адчыняецца семінарыя, прагімназія і шасцімесячныя настаўніцкія курсы. У 1942 годзе пайшлі дзяўчаты, што вучыцца хацелі, у семінарыю. Каля тысячы чалавек навучэнцаў было ў Наваградку. На першы курс сем групаў набралі.

Іна Рытар выкладала нямецкую мову. Дысцыпліна была строгая. Спазнілася аднойчы Алена Грыцкевіч на заняткі, паставіла яе настаўніца ля дзвярэй, увесь урок прастаяць мусіла. Праўда, пазней добра ставілася, ацаніла веды... Усё навучанне было па-беларуску. З тых часоў памятае беларускія вершы, песні.

Усе яны былі сябрамі СБМ. Вось ужо дзе патрыятычнае ўзгадаванне атрымалі! Усе марылі пра Беларусь. Марылі, каб хоць калі пажыць у вольнай Беларусі!

Спаліла свой дыплом за семінарыю, бо каб знайшлі, то не ўратавалася б ад турмы. Многія адседзелі. У 1944 годзе ў медыцынскае вучылішча паступіла. Быццам і не заканчвала семінарыі. Падводзіць вынік:

— То я ўсё жыццё вучылася!

Калі сустракала каго з тых навучэнцаў, каго ў Наваградку ў вайну бачыла, ціха пыталася:

— Вучыліся?

— Вучыліся...

Гэта было як пароль. Вучыліся — значыць нашы, у СБМ былі. Цудам трымаюцца тут, на волі, даносу хапіла б, каб у турму трапіць...

Зброі няма!

Безуладдзе, неразбярыха, страх панавалі на ваенных дарогах летам 1944-га. Кожны, хто са зброяй, можа затрымаць падарожнікаў. Казацкія атрады, немцы, паліцэйскія, партызаны. Хто з лесу выскачыць, хто з мястэчка...

Тым часам з Наваградка ў бок Сянежычаў рухаецца падвода, загружаная няхітрымі хатнімі пажыткамі. Гэта семінарысткі з Воўцы вяртаюцца дадому. Алена Грыцкевіч, Клаўдзя Шпакоўская, Ганна Скок і Гоцка Люда з мамаю. Самі ідуць пешкі, бо воз і так перагружаны. Кіламетраў са тры адышліся ад Наваградка, як раптам вылятаюць з лесу партызаны. Не, каб абмінуць іх і па сваіх справах далей ехаць, дык давай дапытваць, сваю ўладу паказваць:

— Што везяце?

— Нічога.

— Зброя ёсць?

— Зброі няма! — сказана гэта было смела, упэўнена, бо якая зброя ў дзяўчатаў.

Але партызаны вырашылі праверыць. На самым версе падводы ляжаў вялікі чамадан. Яго і адкрылі. А там — пісталет!

Што тут усчалося!..

Як такое магло стацца, што ў такую ліхую пару дзяўчаты везлі зброю, нават не схаваўшы? Гэта ж такая рызыка! Смяротная. Чым яны думалі?

А было вось як. Яшчэ ў Наваградку зямлячак сустрэў Валянцін Сенька з Даўгінава. У час акупацыі ён спачатку вучыўся ў семінарыі, а пасля працаваў у газеце. Таксама дадому кіраваўся. Ехаў на ровары і папрасіў дзяўчатаў узяць чамадан на падводу. Нат паняцця яны не мелі, што там можа быць зброя. Таму і гаварылі так смела. Шчасце іхняе, што між партызанаў былі знаёмыя: Алёшка, камісар з атрада Молатава, які неадройчы прыпыняўся ў Грыцкевічавай хаце, Косця Данільчык. Бажыліся дзяўчаты, што не іхні чамадан, не іхні пісталет. Пакрычалі партызаны, забралі зброю і адпусцілі семінарыстак.

А праз колькі часу даганяе іх Сенька на ровары. Дасталося яму! Увесь свой гнеў і пераҗыты страх яму на галаву вылілі:

— Што ты нарабіў! Ты ж нас падставіў! А каб казакі ці СД наляцелі? Што было б? Пазабівалі б усіх!

А ён і апраўдацца не мае чым. Ніяк не хацеў іх падставіць. Бо і сам мог быць пакараны. У той спешцы, страху скідваў рэчы, не думаючы, безразважна...

Адразу ў 1944-ым з'ехаў Валянцін Сенька ў Львоў і паступіў у палітэхнічны інстытут. Толькі давучыцца не здолеў. Летам прыязджаў на Радзіму. І ў 1948 годзе таксама прыязджаў. А па вяртанні быў арыштаваны. Відаць, данёс нехта...

Вызвалілі Валянціна, як Сталін памёр. На Радзіму так і не вярнуўся. Спачатку жыў ва Уфе, пасля ў Варонежы.

Васілеўскія

Лёва, Люда і Аня. Аднавяскоўцы, сваякі Уладзіміра Калесніка. Героі яго кнігі «Доўг памяці».

Фота www.360tv.ru

Дзеці Феафана Кандратавіча і Марыі Якаўлеўны Васілеўскіх з Сіняўскае Слабады.

Лёва загіне ў пачатку вайны. З гэтым болем, з адчуваннем свае віны пісьменнік будзе жыць усё жыццё. Пра што і напіша ва ўспамінах.

Люда і Аня вучыліся ў Наваградку, у настаўніцкай семінарыі. Там з імі і пазнаёмілася Алена Паўлаўна. Зразумела, усе былі ў СБМ.

У хуткім часе пасля вызвалення Люда разам з іншымі шасцю дзяўчамі была арыштавана, сядзела ў турме ў Наваградку. Зняволенне доўжылася амаль два гады. Была між іх Рада Казела, дачка вайскоўца, героя, які дайшоў да Берліна. Не ведаў бацька, што з іх з гэтаю дачкою. Жонка не магла з-за цэнзуры паведаміць пра няшчасце. А ён у кожным лісце пытаўся пра дачку. У адказ атрымоўваў лаканічнае: «Рада жывая». Толькі ў 1946-ым бацьку перавялі ў Маскву. Маці адразу выправілася да яго. І ў хуткім часе ўсю групу дзяўчат перавялі ў Баранавіцкую турму. Два месяцы прасядзелі яны там без ніводнага допыту. Суд так і не адбыўся. Дзяўчат вызвалілі.

Люда вярнулася ў Наваградак і праз год закончыла педвучылішча. Выпуснікам залічвалі вучобу ў настаўніцкай семінарыі. Працаваць трапіла ў Цырын. Дырэктарам школы быў партызан Мікалай Лопух, які стане яе мужам.

Геройскі чалавек гэты Лопух! Нічога не баяўся. Камуніст, атэіст. Аднак жа чалавечае ў ім заўсёды брала верх. Калі ў вайну партызаны здзекаваліся з цырынскага бацюшкі, збіраліся расстраляць ні ў чым не вінаватага чалавека, Мікалай заступіўся, запатрабаваў адпусціць святара. Зняможаны, той паабяцаў свайму збаўцу:

— Усё жыццё за цябе буду маліцца.

Смелым партызанам быў Мікалай Лопух, першым у атаку кідаўся, а ніколі куля не кранула.

Пасля вызвалення служыў у міліцыі ў Карэлічах. Праўда, нядоўга вытрымаў там. Давялося яму аднойчы канваіраваць жанчыну, якую асудзілі на вялікі тэрмін. Праходзілі яны паўз дом тае няшчаснае. А ў хаце яе маленькае дзіцятка, паўтара годзікі ўсяго, і мама. Папрасілася жанчына развітацца з роднымі, і Мікалай дазволіў. Зразумела, што парушыў закон, што не меў на тое права. Міліцыянер Лопух не меў права дазволіць маці развітацца з дзіцём, а чалавек Лопух не мог забараніць маці мо апошні раз убачыць сваё дзіця.

Дасталося яму за гэтую «мяккацеласць». Гэта ж ворагу паспачуваў! Дакаралі, крычалі, пагражалі суворыя законнікі. А ён не надта спалохаўся. Рапарт на стол і — на фронт. Да самае перамогі ваяваў. Ізноў ні разу паранены не быў.

Пасля вайны, мы ўжо ведаем, трапіў у Цырын.

У Мікалая і Людмілы нарадзілася дачушка. Усё, падавалася, няблага было. Але данесла на маладую настаўніцу адна пільная каляжанка, усходніца: была сябрам СБМ! Людміла засталася без працы. А на дырэктара школы пачаліся ганенні. Выклікалі, патрабавалі:

— Або разводзішся, або кладзі партбілет!

— У нас жа дзіця! — імкнуўся ён запярэчыць. На што пачуў:

— Мы і яе, і дзіця так запакуем, што ніколі не даведаешся, дзе яны!

Ды не на такога, каго запалохаць можна, натрапілі. Нікому нічога не сказаў, сабраўся і паехаў у Маскву да Калініна праўды шукаць. Да каго ён там трапіў, невядома. Але праўду знайшоў. Пакінулі маладую сям'ю ў спакоі. Перавялі на працу ў Кудавічы. Людміла да пенсіі ў школе працавала...

Прытулак партызанаў

Воўца — вёска невялікая, гарою атуленая. З двух бакоў лес абступае. У вайну не стаялі тут стала ні немцы, ні паліцаі. Наляцяць, напалохаюць людзей — і зноў ціха. Таму і з'яўляліся сюды начныя госці, партызаны. Перадыхнуць, адпачыць. З розных атрадаў. Асабліва часта завітвалі з 2-га Камсамольскага і Молатава.

З павагай згадвае Алена Паўлаўна начальніка штаба «камсамольцаў» Уладзіміра Калесніка. Пазнавалі бацькі ягоны стук у акно. Далікатна пастукае, пачакае, каб гаспадары ўсталі, апрануліся.

Прыехаў аднойчы прамоклы ўвесь, стомлены страшэнна. І адразу спаць пайшоў. Боты мокрыя, анучы мокрыя. Паклала гаспадыня на печ прасушыць. Толькі заснуў, а тут вартавы ляціць:

— У вас Калеснік? Будзіце хутчэй!

Ускочыў і боты нацягваць стаў. А халявы ў іх гармонікам ды так прамоклі, што нацягнуць не можа... Праўда, трывога тая дарэмная была, бо не немцы наляцелі, а яшчэ адзін атрад. То вярнуўся начальнік штаба да Грыцкевічаў. А ранкам зноў з ботамі бяда. Ніяк тыя гармонікі не нацягваюцца. Падала гаспадыня партызану свае сухія анучы. І ягоныя высушаныя...

Уяўляю, якім мілым быў яму гэты шчыры клопат сталае кабеты. Праўдзівая мацярынская ласка. Яму, які маці ўжо не меў і моцна пакутаваў з-за гэтае страты, з-за жыцця яе нешчаслівага...

Цяжка было гаспадару Грыцкевічу без каня. Часам партызаны прывядуць якога. А пасля наляцяць і зноў забяруць. Аднойчы адпачываў у Грыцкевічаў Калеснік, а тут заляцелі ў хату з іншага атрада. І адразу да гаспадыні:

— Конь ёсць?

— Не, нямашака, — адказала тая.

Не паверылі. У хлеў пайшлі. Выводзяць каня і з такою злосцю да Грыцкевічыхі:

— Ах ты, старая, яшчэ абманваеш нас!

Паклікала гаспадыня Калесніка. Зразумелі тыя, што абмылачка выйшла і зноў на кабету накінуліся:

— Ах ты, старая! Хоць бы сказала, чый у цябе конь!..

Летам 1951 года, калі Алена Паўлаўна жыла ў бацькоўскай хаце, завіталі да іх нечаканыя госці. На роварах прыехалі. Былі гэта беларускія пісьменнікі Янка Брыль, Алесь Адамовіч і Уладзімір Калеснік. Папрасілі малака, спыталі пра бацьку. Пашкадавалі, што няма ўжо яго. Згадаў былы начальнік штаба Паўла Грыцкевіча добрым словам. Успомніў, як неадройчы частаваў той партызанаў сваім моцным тытунём...

Збіралі пісьменнікі матэрыял для кнігі «Я з вогненнай вёскі» пра злачынствы фашыстаў на нашай зямлі. Але пра тое, як партызаны распраўляліся з людзьмі ў Воўцы, і не толькі ў гэтай вёсцы, як хаты людскія палілі, забівалі, у кнізе, што выйшла ў 1975 годзе, быць не магло.

Рукі цалавала

Паліцэйскі Нягода з Загора Дзялятчыцкага пасля вайны апынуўся ў Амерыцы, у Чыкага. Цягнула яго на Радзіму. Не адчуваў за сабою віны перад людзьмі, перад родным краем. Таму і прыехаў, як толькі магчыма стала. На магілкі хадзіў, магілы бацькоўскія адведаў. Калі ішоў па вуліцы, перастрэла яго Люба Кукаловіч, кінулася на калені і давай рукі цалаваць...

Паліцэйскаму, здрадніку? Гэта савецкая прапаганда ўсё вымалявала двума колерамі: паліцэйскія — ворагі, здраднікі, а партызаны — героі, змагары. А ў той страшны час усё перакручана было. Часам здзіўляе людскасць ворагаў і бесчалавечнасць сваіх. Вось жа, трапіла Люба ў пастарунак у Любчу. Звязаная была з партызанамі. Чакала яе смерць. А вартавым якраз быў Нягода. Паклікаў дзяўчыну і прашаптаў:

— Я ноччу прыадкрыю дзверы, а ты ўцякай.

Выратаваў паліцэйскі Любу ад немінучае смерці. Таму і цалавала рукі. За жыццё ўратаванае дзякавала...

Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

Старонкі з «Памятнай кніжкі»

Просты вандроўнік

16 лютага 2002 г., субота.

Просты вандроўнік зайшоў у страшны лес і ніяк не мог з яго выйсці.

Дзень шукаў дарогу і ноч; і яшчэ дзень, і яшчэ ноч.

Ды ўсё марна.

Урэшце, стомлены, галодны і напалоханы, звярнуся да Бога:

— Божа, дапамажы адгэтуль выйсці!

— А ты любі сваё і выйдзеш! — адказаў Бог.

— Як гэта?! — не ўцяміў пуставаты вандроўнік.

— А так, любі сваё і выйдзеш...

Але някемлівы не ведаў, што такое сваё і як яго можна любіць, і мусіў прасіць Бога, каб ён навучыў палюбіць сваё...

— Вось табе песенька на тваёй роднай мове. Як заспяваеш яе, дык адразу ж і выйдзеш з гэтага лесу! — сказаў Бог.

— Але ж я не ведаю роднае мовы! — прызнаўся вандроўнік.

Бог, як вядома, заўсёды і шчыры, і добры; ён пашкадаваў няшчаснага і сам заспяваў песеньку, і, дзякуючы божаму спеву, небарака вандроўнік нарэшце выйшаў з непраходнае страшнае гнечы (гнеча (давыд-гарадоцкае) — пушча)...

А яно ж і напраўду — роднае ратуе, выводзіць, выбаўляе з бяды, бо сваё...

Дубянецкі

4 сакавіка 2002 г., панядзелак.

З пакуль яшчэ ненадрукаванай кнігі лірычных запісаў і мініяцюр Янкі Брыля «З людзьмі і сам-насам» я з прыемнасцю ўзяў на заметку гэтыя радкі:

«Каторы ўжо нумар чытанне «Полымя» пачынаем з дзённіка Дубянецкага. Мяркую па сабе і па сябрах. І чалавек гэты, значны і пры жыцці, яшчэ прыгажэй раскрываецца сёння. І час, які ён так рупліва апісвае, васьмідзясятыя гады, бачыцца па-гістарычнаму праўдзіва, шырэй за справы толькі выдавецкія, і незабыўныя чыноўнікі, што кожны па-свойму тармазілі прагрэс, дзейнічаюць у летапісца Міхася на цэкоўскіх ды камітэцкіх падмостках з жывой тэатральнай пацешнасцю...».

Мая чытацкая ўвага перш за ўсё ўзбагацілася словазлучэннем — «летапісец Міхась».

Сапраўды, летапісец — пісьменнік, які грунтоўна, цікава і непаспешліва адлюстраваў добра вядомыя яму падзеі; прыстойна паказаў само паветра гэтых падзей.

Дык вось, калі ў друку нарэшце з'явіўся Ягоны дзённік, я канчаткова пераканаўся: Ён не толькі выдатны грамадзянін Беларусі і гаспадарлівы стваральнік нацыянальнае выдавецкае прасторы, не толькі працавіты перакладчык і чалавек са шляхетнымі манерамі, а Ён яшчэ і пісьменнік, мастак, майстар па-сапраўднаму жывой мемуарнай прозы.

Пра сябе менавіта як мастака Ён ніколі не казаў.

Самаатэстацыя, а тым больш самахвальства — не ўласцівы яму занятак.

Але, пэўна ж, адчуваў сябе роўным сярод роўных у пісьменніцкай сябрыне і найбольш хінуўся да тых творцаў, якія жылі не паводле законаў лічбы, а паводле законаў слова.

Па-скарынаўску разумеў: залежнасць ад слова і незалежнасць ад лічбы — неабходная ўмова, пры дапамозе якой душа пакрысе вызваляецца ад халопства і становіцца мужнаю.

Такая душа недатыкальная, як музыка.

Такая душа ўсміхаецца, як Бог.

І тады ў ёй ужо няма, ці амаль няма — ні надуманай рызыкоўнасці, ні кволай разгубленасці, ні лёкайства, ні страху перад санавітымі хамамі.

Ёсць перш за ўсё Божая ўсмешка...

Дарэчы, Ён часта ўсміхаўся; усміхаўся амаль заўсёды, нават у свае апошнія бальнічныя дні, — калі размаўляў, калі слухаў, калі яму балела, калі цытаваў (і, дарэчы, невыпадкова цытаваў!) Янку Купалу:

Хоць дух будзе шыпець у бяссіллі,
На сваіх вісі жылах і смейся!..

Але гэта так у паэзіі, а ў жыцці — пафасу, вядома, менш, а страху больш.

Аднойчы Ён расказаў мне, як адвёў небяспеку ад сваёй дачкі, тады яшчэ школьніцы, малодшай Ірынкі: яна купалася ў Днястры і раптам пачала тануць...

— Ратуючы Ірынку, я згубіў у вадзе залаты заручальны пярсцёнак! Не... Не згубіў, заплаціў ім малдаўскаму Днястру, каб не забіраў маё дзіця...

Заплаціць малдаўскаму Днястру за жыццё дачкі заручальным пярсцёнкам!

Гэта мова творцы!

І я ўспрыняў пачутае не проста як вуснае, напоўненае востраю трывогай апавяданне, а як фрагмент ужо занатаванай дзённікавай прозы — той ёмістай прозы, якая народжана не ўяўленнямі і марамі, а самой явай.

Увогуле ж, Ягоная мемуарная проза — праца майстра, усё ўменне і сілы якога пайшлі на пераўтварэнне жыццёвай цярплівасці ў літаратурную заўсёднасць.

Значнасць Ягонага шчырага дзённіка роднасная мастацкай і гістарычнай значнасці драматычнай «Споведзі» Ларысы Геніюш, развацжлівым «Лісткам календара» Максіма Танка і балючай «Аповесці для сябе» Барыса Мікуліча.

Ён стварыў кнігу па духу блізкую нашым адметным і запамінальным кнігам, у якіх адвечнае беларускае трыванне паказана як неабходны і вяршынны знак, без якога немагчыма беларуская вечнасць.

13 красавіка 2004 г., аўторак.

Перачытваю «Круглянскі мост» Васіля Быкава...

Не магу сказаць, што Быкаў мой любімы празаік, аднак жа прыкладна раз на год выбіраю вольны тыдзень, каб перачытаць той ці іншы ягоны твор.

У прозе Быкава крытыкі бачаць уваскрашэнне традыцый Рэмарка і Камю і адзначаюць, што ён узбагаціў сусветную літаратуру ўласна беларускім псіхалагізмам.

У гэтым галоўная асаблівасць майстра, які пісаў на мове Янкі Купалы.

Ад славутых еўрапейцаў Быкава адрознівае не толькі мова, але і беларускае разуменне чалавека, вайны і часу.

Чалавек паводле Быкава заўсёды знаходзіцца ў напружаным дыялогу са смерцю; яму не варта нагадваць вядомую мудрасць «памятай пра смерць», бо ён народжаны з гэтай мудрасцю; ён існуе ў сітуацыі непазбежнага выбару: здрадзіць, каб застацца жывым, ці памерці, каб не здрадзіць!

Вайна паводле Быкава — памяншэнне людскасці, а час — бясконцы стан, пры якім памятаецца толькі бяда...

Проза Быкава — уласнасць Беларусі!

Даводзіцца і гэтак сцвярджаць, бо нашыя суседзі часам вельмі дзіўна сябе паводзяць у дачыненні да быкаўскай спадчыны.

Вось гартаю хрэстаматыю для 11 класа сярэдняй школы «Русская литература XX века», выдадзеную маскоўскім выдавецтвам «Просвещение» ў 1993 годзе.

У яе ўключана і быкаўскае апавяданне «Адна ноч», але не пазначана, што гэта пераклад з беларускае мовы.

Нібыта апавяданне было адразу створана па-расійску!

І ў кароткай біяграфічнай даведцы не сказана, што Васіль Быкаў — беларускі празаік.

Словам, з ласкі складальнікаў хрэстаматыі школьнік, скажам, Калужскай ці Валагодскай губерніі, пэўна ж, лічаць аўтара «Сотнікава» расійскім творцам.

А вось яшчэ...

Летась маскоўскае выдавецтва «ЭКСМО» ў серыі «Красная книга русской прозы» (назва серыі, дарэчы, двухсэнсоўная) выпусціла том быкаўскіх аповесцяў пад агульнай назвай «Дожить до рассвета».

І зноў жа нідзе — ні ва ўступным артыкуле, ні ў выхадных даных, ні ў анатацыі, ні на тытуле, ні ў змесце — не адзначана, што гэтыя аповесці перакладзены на расійскую з беларускай мовы і што іх аўтар — беларускі пісьменнік...

Як той казаў, дзякуй братам, што хоць імя Быкава пакінулі беларускім — Васіля не перарабілі ў Василия...

Вялюгін

16 лістапада 2004 г., аўторак.

У Ягонай паэзіі чаромха застаецца чаромхай, холад холадам, мёд мёдам, верас верасам, вір вірам, а лес лесам; сонца заўсёды поўнае ягаднага соку, птушынага свісту, рыбіных скокаў; зямля, неба, агонь, вада захавалі прыродную сваю сутнасць...

Ягоныя строфы настолькі вырáзныя і тонка апрацаваныя, што падобныя на манеты.

Мяркую, страфічнаму майстэрству Ён вучыўся ў Пятра Глебкі, якога вельмі любіў.

Рытміка ж Ягоных вершаў — гэта да звону нацягнутая жылка-струна, якая злучае ў адно моцную руку вудара і дужую ў рацэ, але ўжо злоўленую стронгу...

Ён умеў уплываць на паэтаў, і таму яны — ад майстроў да пачаткоўцаў — былі гэтак жа залежныя ад Ягонай рэдактарскай прысутнасці, як добры настрой бывае залежны ад алкаголю.

Не з'яўляючыся рабом пісьмовага стала, заўсёды быў ударом сяброўскага застолля!

Яго паэма «Вецер з Волгі», празаічна разлічаная на Купалаўскую прэмію, аказалася ўзорам сапраўднай паэзіі...

Ён здолеў скінуць з сябе ланцугі сталінізму і ў канцы жыцця вярнуўся да ідэалаў нацыянальна-дэмакратычнай Беларусі...

Голуб над ясенем, а пад ясенем лось — гэта Ягоны герб.

Я веру, што Яго калыска сапраўды — з салаўінай пушчы, а Ягоная труна — з дрымотнага бору.

16 траўня 2005 г., панядзелак.

Я знаю: кнігі Васючэнкі
Малы чытае і стары;
Паны чытаюць і паненкі,
Спадарыні і спадары...

Пятро Васючэнка — стваральнік лагоднай казачнай весялосці, майстар незапазычанай думкі, яго інтэлект узбагачаны філасофіяй Дон Кіхота.

Я не хачу сказаць, што П. Васючэнка з ліку тых летуценнікаў, якія змагаюцца за нейкія ўяўныя, а то і зусім смешныя ідэалы; проста хачу звярнуць увагу на бескарыслівасць нашага пісьменніка, — П. Васючэнка па-донкіхотаўску высакародны ў сваёй любові да беларускай літаратуры.

Для яго наша літаратура — тысячагадовы шлях, які мае пачатак, але не мае завяршэння; літаратура — аднаісная вечнасці.

На яе класічных прыкладах П. Васючэнка растлумачыў сваім чытачам прыроду здрады і прыроду любові і пры гэтым дакладна заўважыў:

«...Беларус не клапоціцца, каб яго любілі; беларус клапоціцца, каб яго не чапалі...»

Зноў жа на класічных прыкладах нашай літаратуры спадар Васючэнка з тактоўнай іроніяй паясніў адной начытанай замежнай знаёмай: чаму мы, беларусы, заўсёды былі, ёсць і будзем...

Пясняр сям'і

26 ліпеня 2006 г., серада.

Жыццё Янкі Брыля — жыццё Беларусі; тая духоўная прастора, асноўныя вехі якой — творчасць і радзіна (сям'я).

Само паняцце «творчасць» для пісьменніка было святым, ён верыў у самадастатковасць творчасці, у яе бясконцае існаванне, выяўленае, вядома ж, праз беларускае слова, праз беларускі зразумелы колер.

Творчасць як вырошчванне хлеба — гэтая ідэя блізкая Янку Брылю...

Ён працаваў па-сялянску ашчадна, умеў дакладна разлічыць суадносіны пачуцця і думкі, ухіляўся ад гучных сюжэтаў, шчасліва пазбягаў доўгапісання, любіў сціслы вербальны малюнак, не верыў у апавядальны дынамізм, таму ягоная проза непаспешлівая, як Нёман.

Мастацкасць Янкі Брыля — не набытая, а прыродная!

Яго раман «Птушкі і гнёзды» будзе заўсёды нагадваць нам аб тым, што беларус абавязкова (!) павінен з чужыны вярнуцца на радзіму; а калі тое немагчыма, то на чужыне павінен заставацца беларусам.

Яго аповесць «Ніжнія Байдуны» будзе вечна сведчыць пра тое, што і беларусы — нацыя весялосці, нацыя здаровага смеху і гумару; іншая справа, што гэтым карнавальным мастацтвам мы незаўсёды ўмеем карыстацца.

Апавяданні ж «Memento mori» і «Апоўначы», а найперш вялікая кніга «Я з вогненнай вёскі...», створаная разам з Алесем Адамовічам і Уладзімірам Калеснікам, так і будуць пераканаўча казаць свету пра нашае гістарычна-галоўнае: беларусы — не пасіўныя ахвяры нацызму, а яго пераможцы.

Мініяцюры Янкі Брыля — свята псіхалагічнай назіральнасці, казачнасць нашай вёскі і мястэчка, ратушнасць нашай сталіцы, спраўджанасць Купалавай мары: роднае не знікне!

Урэшце згадаю і сямейную сагу «Муштук і папка», але не толькі таму, што гэта ці не самы яркі твор у нашай літаратуры на страшную тэму палітычных рэпрэсій, а перш за ўсё таму, што гэта менавіта сямейная сага — своеасаблівы маральны дакумент, паводле якога сям'я з'яўляецца для чалавека ці не асноўнай каштоўнасцю.

Радзіма — галоўная тэма Янкі Брыля.

Праз усё сваё доўгае жыццё памяркоўна і ўпэўнена пісьменнік даводзіў, здаецца, усім відавочнае: беларусы — нацыя не раскідная, а сямейная.

І ў гэтым было нешта царкоўнае, у тым сэнсе, што і святары, бадай, штодзённа гаворань нам пра тое, пра што мы і самі ад нараджэння ведаем: шануйце бацькоў, шануйце свой род, шануйце сям'ю...

Радасна мне ў гэтым развітальным слове казаць пра Янку Брыля, шляхетнага класіка і прыгожага чалавека: ён напісаў цудоўныя творы і стварыў цудоўную сям'ю.

Радасна таксама згадаць яго пранікліваза вучня Міхася Стральцова, які аднойчы заўважыў, што празаік Янка Брыль мае «непапсаваны танны парадаксальнасцю розум».

Мусіць, гэта самы дакладны партрэт аўтара «Птушак і гнёздаў», прачулага песняра беларускай сям'і.

Уладзімір СЦЯПАН

Вялікі перапынак

Фота www.ukrbin.com

Калядны вечар

Мы сустрэліся ў паўцёмным тамбуры гастранома. Я выходзіў, а ён заходзіў. Мужчына схапіў мяне за локаць, паглядзеў ў твар і засмяяўся: прыязна, бяззуба і радасна.

— Не пазнаў? Не пазнаеш? Ну, думай… — гучна гаварыў ён і сціснуў мой локаць, спрабаваў мяне хістаць, як маладзенькае дрэўца.

— Не… Не пазнаю, прабач.

— Не надта ўпэўнена адказаў, і яшчэ раз угледзеўся ў шэры няголены твар. Паспрабаваў убачыць яго дзіцячым, юначым.

— Прабач.

— А я цябе дык адразу пазнаў, імгненна, хоць ты і акуляры начапіў. Мамка твая на Першамайскай жыла, у першым пад'ездзе. Правільна?

— На Першамайскай… Яна і цяпер там жыве. Я да яе і прыехаў…

— Мамка жывая — добра! Ты, нават не можаш сабе ўявіць, як гэта добра. Перадавай ёй ад мяне прывітанне… Яна ж мяне ў кіно пускала… Гэх! Добра было… А мае ўсе памерлі. І бацькі, і жонка, і цешча з цясцём. Пайшлі са мной. Гэта ж цуд самы сапраўдны, дзіва нейкае, што я пайшоў сюды і цябе сустрэў. Ну, пазнаў мяне? Эдзік я! Эдзік!

Я шчыра хацеў пазнаць Эдзіка, але не атрымлівалася, бо не было сярод маіх аднакласнікаў Эдзіка.

— Значыцца, састарэў я моцна, але цябе ж пазнаў. Любка казала што ты пісьменнікам задзелаўся, а ёй кажу, што не можа такога быць, бо які з яго пісьменнік… Праўда?

Ён давёў мяне да аддзела з бліскучымі бутэлькамі, якія прапаноўвалі сябе, як танцоркі на сцэне.

— Жанка, хадзі сюды, са святам цябе… Гэта ж нашага Толіка дачка. Нам гарэлку і цыгарэты з фільтрам.

Жанка паглядзела на нас з цікавасцю, перапытала, якую даваць, падала бутэльку. Эдзік беражліва прыняў яе і схаваў у кішэнь за крысом паліто.

— Жанка, сёння больш не прыйду, не спадзявайся. Са святам цябе! А Толік памёр праз год пасля турмы.

Апошні сказ прагучаў ціха, да мяне.

Мы выйшлі з цёплай крамы на халоднае паветра, і Эдзік закурыў. Мігцелі рознакаляровыя, як кветкі на летняй клумбе, агеньчыкі каляднай ілюмінацыі, церусіў снег, Эдзік выглядаў шчаслівым.

— Пойдзем да мяне. Ёсць у мяне і закуска, а вось пагаварыць няма з кім… Памятаеш, як мы з табой на балоце ад мянтоў уцякалі? От жа здаровыя былі. Беглі, як тыя алені па кустах, — па траве, па вадзе…

— Мне да мамы трэба. Яна не ходзіць, трэба яе пакарміць, прыбрацца, прабач…

— А пайшлі разам, я павіншую яе са святам, давай я ёй шакаладку куплю. Пачакай, я зараз. Адна нага там — другая тут!

Ён наважыўся вярнуцца ў краму, але я затрымаў яго і сказаў, што не трэба ні шакаладкі, ні апельсінаў. Што я пайду адзін, што я жадаю яму ўсяго найлепшага.

Эдзік спахмурнеў. Яго твар сціснуўся. Рукі апусціліся. Ён глядзеў на мігатлівую святочную вітрыну.

— Сто гадоў не бачыліся — і вось так… — Сказаў шэптам, выцягнуў бутэльку і падаў мне.

— Вазьмі, вып'і за маё здароўе, свята ж вялікае, Колька!

— Эдзік, я не Колька! Ты пераблытаў мяне з малодшым братам.

Эдзік прыцісцуў бутэльку да грудзей і застаўся стаяць пад вітрынай, а я пайшоў варыць маме манную кашу.

Званок

Сяджу на доўгай лаве побач з баскетбольным шчытом. Вецер хістае рэшткі сеткі, а ў вокнах аднапавярховай школы плывуць белыя аблокі. Пахне глінай, цэглай, пілаваннем і будаўнічым друзам… Будоўля бязлюдная — сёння нядзеля. У што перарабляюць школу — не ведаю.

Падхопліваюся, азіраюся, падскокваю і лаўлю цяжкі баскетбольны мячык. Не, ён не шурпаты, бо пупырышкі сцёрліся аб асфальт баскетбольнай пляцоўкі. Але мячык добра падскоквае, і я прыгінаюся, гупаю ім і бягу па краі пляцоўкі, амаль па самай нябачнай лініі, абводжу Віцьку, потым даю нырца пад руку Сяргея, а перад Толікам (ведаю, яго прайсці не атрымаецца), спыняюся. Гляджу яму ў вочы, падскокваю і аберуч кідаю мячык у шчыт…

Толік Купрыч памёр ад сухотаў, калі вярнуўся з турмы… Сяргея Маскалевіча забілі на шабашцы ў Расіі… Віцька Тузевіч павесіўся ў гаражы, бо не хацеў пакутваць…

Запыханы, вяртаюся на сваё месца і думаю: «Добра што мяне ніхто не бачыў»… Сур'ёзны мужчына, а бегае па пустой пляцоўцы, падскоквае, быццам кідае мячык…

У вокнах школы плывуць аблокі…

Асфальт спартыўнай пляцоўкі парэпаны, праз шчыліны трава лезе, расце…

Скрыгатнула жалезная брамка. У школьным двары з'явілася старая ў вязанай шапцы цытрынавага колеру. Яна ледзь заўважна кульгала да пляцоўкі. Дапамагала сабе кійком, абыходзіла гурбы смецця, стосы пакарабачаных лістоў іржавай бляхі, дошкі, пачарнелыя бярвёны, цэглу. Старая ішла і глядзела на школу, а дакладней — на доўгі вохрысты будынак са знятым дахам, з вялікімі вокнамі, дзе плылі белыя аблокі.

Калі яна праходзіла побач, то паглядзела на мяне і павіталася. Адказаў на яе «Добры дзень!» і падхапіўся, як школьнік, калі ў клас уваходзіць настаўніца. Яна спынілася, некалькі імгненняў вывучала мяне, але не пазнала. Не дзіва, з таго часу, як мы бачыліся апошні раз, прайшло сорак тры гады. У руках настаўніцы геаграфіі была алюмініевая лыжная палка з пластыкавай ручкай і скуранай пятлёй. Не мной заўважана, што галасы настаўнікаў не змяняюцца, яны застаюцца тымі ж, гучаць праз гады, як і гучалі…

Я зірнуў на яе адмысловы кій і адразу згадаў, як яна, маладая і прыгожая, уваходзіць у наш восьмы «Б», і мы падхопліваемся, бо Зоя Станіславаўна нам падабаецца, бо яна прыгожая і вясёлая.

— Вы мяне ведаеце? — пытанне прагучала тым жа голасам, як на ўроку.

— Ведаю, вы — Зоя Станіславаўна, выкладалі тут геаграфію…

Я сказаў, у якім годзе скончыў школу і паехаў вучыцца ў Мінск, назваў сваё імя і прозвішча, але яна не змагла згадаць…

Мы сядзелі і моўчкі глядзелі на школу з разабраным дахам і цэлымі вокнамі.

— Купрыч Толя, Маскалевіч Сяргей, Тузевіч Віктар — добра іх памятаю… — сказала і павярнулася да мяне.

— Зоя Станіславаўна, а ў вас была такая вялікая малахітавая брошка, зялёная… Мне вельмі падабалася.

— Брошка?… Была і ёсць! Вось, глядзіце… — яна прыставіла да лавы кіёк, расшпіліла гузік свайго рабенькага паліто, расхінула вязаны шалік — і на шэрай кофце бліснуў зялёны камень, з пражылкамі, як на жніўеньскім ліпавым лісце. — Звычайна вясной, а не восенню, я прыходжу сюды і тапчуся побач, а бывае і вакол школы абыду… І мне так добра робіцца, быццам трэба зноў у клас ісці. Пачынаю хвалявацца, бо галасы дзяцей чую… І гэта… Вось, чуеце, чуеце? Званок! Гэта на трэці ўрок, а потым будзе вялікі перапынак.

Старая настаўніца паднялася, наструнілася… І я стаяў, прыслухоўваўся. Гудзела машына. У гаражах сквытала «балгарка», грукаў па жалезе малаток. Брахаў на балконе сабака. За паркам, на шашы, сігналілі машыны…

— Не, не чую, Зоя Станіславаўна!..

Яна паглядзела на мяне так, як тады… Быццам я не вывучыў урок. Развіталася, пажадала добрага дня і закульгала да рыпучай жалезнай брамкі. На баскетбольным шчыце гайдалася падраная сетка. Яна так гайдалася і тады, калі мной кінуты мячык ад шчыта трапіў у кальцо, а Віцька Тузевіч, па мянушцы Туз, падскочыў і ўчапіўся за сетку… Сетка падралася…

Настаўніца геаграфіі аддалялася. Школа глядзела на свет цёмнымі вокнамі. У іх бязгучна плылі белыя аблокі… І раптам я пачуў ціхі школьны званок, а потым дзіцячыя галасы… Падумаў, што вялікі перапынак скончыўся.

Крапіўніца (Aglais urticae)

У пральнай машыне, за пукатым шклом, павольна паварочваліся зімовыя шалікі, і там, як у дзіцячым калейдаскопе, штохвілінна змяняліся камбінацыі колераў. На пліце варыўся ягадны кампот, уздымалася бачная ў сонечных промнях пара, і пахла ў кухні так, як пахне пагодным летнім днём. На стале, у плыткім белым кубку, павольна разгорталіся цёмна-зялёныя лісцікі, і кіпень памалу рабіўся залатым… Жанчына акуратна кранула кубак, хіснула яго — лісцікі прыўзняліся і пачалі апускацца на дно.

У кухні ад яркага сонечнага святла ўсё зіхцела і ззяла: посуд, падлога, кафля, мэбля, шкло. І сама трыццацічатырохгадовая Таццяна — гаспадыня ўсяго гэтага духмянага, яркага і бліскучага свету, выглядала прывабна. У чорным шкле тэлефона адлюстроўвалася вакно, прычыненыя дзверы на балкон, парэнчы, блакітнае неба (такім яно бывае толькі ў красавіку), аблокі, асветленыя ранішнім сонцам, парк, ледзь крануты жоўта-зялёным дымам пупышак, і далей — бела-залаты горад.

Жанчына падняла руку, павярнула далонь, і яна трапіла ў сонечнае святло, быццам у алей. Пазногці мякка зазіхцелі, а кончыкі пальцаў засвяціліся ружовасцю. І на жаночай шчацэ ззяла сонца, і вуха ружавела, а валасы блішчэлі…

Пральная машына змоўкла, колеры перасталі перамешвацца. Сіні шалік ляжаў на жоўтым, а зверху чырвоны і маленечкі кавалак белага з махрамі. У кухні зрабілася ціха і ярка. Вуліца і горад сталі чутнымі…

І тут жанчына заўважыла цень па-над плітой — імклівы і трапяткі. Рукі апусціла на калені і вачыма пачала сачыць за матыльком, які пералятаў то са святла ў цень, то з ценю ў святло, каб зрабіцца яркай вогненнай кропляй. І гэты матылёк, які невядома адкуль з'явіўся ў кватэры на апошнім паверсе, лётаў па кухні, над бліскучым шклом, пластыкам, кафляй… Ён, быццам шукаў, дзе спыніцца і адпачыць.

Матылёк сеў ёй на плячо, і Таццяна адчула лёгкі бязважкі дотык. Яна баялася паварушыцца, скрануцца, каб не спалохаць трапяткое стварэнне. Касавурылася, але бачыла толькі расплывістую яркую пляму з чорным краем.

Матылёк пераляцеў з пляча на калена, а потым на руку, на ўказальны палец.

«Божа, ты ж прападзеш тут!» — прашаптала Таццяна і павольна паднялася, трымаючы перад сабой руку з трапяткім матыльком, які то разгортваў крылцы, то складаў, як далоні… Босай нагой яна расхінула балконныя дзверы шырэй, выставіла руку на прахалоднае паветра, і матылёк паляцеў — спачатку да цёмных дрэваў, а потым у неба…

Таццяна ўспаміналя таго матылька некалькі дзён і ўсміхалася, але потым забылася, занятая аднастайнымі штодзёнымі клопатамі. Забылася так, быццам і не было таго лёгкага дотыка да голага калена, да пляча, да рукі… Успомніла праз тры тыдні, калі стаяла на людной вуліцы — расчырванелая і разгубленая. Яна толькі што выйшла з паліклінікі. Выцягнула з кішэні мабільнік, убачыла сваё адлюстраванне і паправіла пасмачку валасоў, заклала яе за вуха. На экране з'явіўся твар няголенага мужчыны з нахабнай і бесклапотнай усмешкай, з глыбокімі залысінамі. Прыціснула мабільнік да вуха, уздыхнула, як набрала паветра, і націснула «выклік».

— Алё! Прывітанне, Таццяна, не маўчы!

— Сімановіч, ты мяне чуеш? Сімановіч, ты — гад!

— У сэнсе?

— Я — цяжарная…

— Да ладна…

Нібы ў казцы...

Васіль ЗУЁНАК

Фота www.mykharkov.info

***

Гамана, гам, га́мы, —
Пяклуюцца дзень пры дні.
А вынік усё той самы:
Хочацца цішыні.

А яна ўжо не за дзвярыма,
А яна ўжо на покуць глядзіць,
Куды ўсе дарогі, нібы да Рыма,
Сыходзяцца, каб не хадзіць.

Во тады і падступіць жаданне —
Абложнае — залучыць да труны
І га́мы дзіцячае гранне,
І гам, і гул гаманы...

Бяро́зіна... Беразіна́...

«Камоцкі Алесь... нарадзіўся ў 1958 годзе ў Барысаве...»! — прачытаў я ў часопісе «Дзеяслоў»...

Алесь Камоцкі!.. Я ў адчаі
Ад цемнаты сваёй: не знаў,
Што мы з табой — барысаўчане!..

Бяро́зіна?.. Беразіна́? —

Вось як і тут: дзе ставіць націск, —
Не знаў!.. Хоць і дагэтуль мне —
А столькі ж год ужо растраціў! —
Карціць, нібы асцё ў гумне, —

Пад шум і гоман малацьбітны:
Камусьці ж зерне — ды ў руку!..

І я ў Барысаве, нібыта
Ўсё цэпам б'ю на тым таку,

Дзе педвучылішча збірала
З вясковых хат у інтэрнат
Падросткаў — пастушкоў бывалых,
І іх равеснічак-дзяўчат...

Дзе нас на вуліцы Студэнцкай
Вучыў нязломны Замерфельд,
Што сам па кампартыйных цэнзах
Насіў няўдачніка партфель...

І суцяшаў мяне: «Як Ставер,
Ды й лепей будзеш вершаваць!..»
(А Ставер — воляю абставін —
Свой «курс» тут мусіў завяршаць...)

Барысаў... Першаю прапіскай
Адзначыў рыфмаю мой спеў...

А ты, Алесь, яшчэ й калыскі
Тады барысаўскай не меў....

Яшчэ ты і не нарадзіўся,
Як я пакінуў горад наш...
А вось жа лёс распарадзіўся:
Нас на раку заве ў вяж...

Ах рэчка, рэчка, дзе твой кацер?.. —

Бяро́зіна?.. Беразіна́? —

Хто плынь і моц тваю растраціў —
Ледзь не да саменькага дна...

Дзе той паром і дзед, што строга
Нас у загрэбшчыкі стаўляў
І ў Новы горад са Старога,
Лічы, за так перапраўляў...

Аднак хадзем... Праз перашкоды...

Бяро́зіна?.. Беразіна́... —

У нашым лёсе назаўсёды
Ты непаўторная вясна...

І знайце: чэрпае Камоцкі
З Бяро́зіны-Беразіны́
Гітары — слова спеўнай моцы,
А слову — розгалас зямны.

Таму і рад быў Барадулін
Тым спевам, нібы рунь дажджу.
А я? — надзею з ёй гадую,
Сны па-барысаўску гляджу!..

Нацыя

Пры дзяржджэкарацыях
І са сталіцаю,
Пры байбаках з правадырскай амбіцыяй
І з помыслам тайным на каранацыю, —

Якімі абудзішся навальніцамі,
Ніцая нацыя,
Нацыя ніцая?..

Дзяльба

Я не прарок, не правідзец,
Ды неба падказвае мне:
Асвенцыма лёс і Лідзіц
Планету маю не міне.

Паўторым: Захад ёсць Захад,
А ўсупраць: Усход ёсць Усход.
Я не палохаў бы крахам
Устоі, ды ведаю код:

Калі пачынаюць народы
Адзінага Бога дзяліць,
Не знойдзе сам Бог перашкоды
Абвал той у пекла спыніць.

І кожнаму свой Усявышні
Зямны абяцае рай
З пытаннем: «А хто тут лішні?!.» —
І кідае свет у раздрай.

Прабачце мне, сытыя людзі,
І я мог бы сыта маўчаць,
Ды Ўсход у галодным прысудзе
Алаха ідзе выручаць.

Пад нашы гарматныя жэрлы
Маўчком, на ўсходні манер,
Вылузваецца крываэжэрна
Новай эпохі звер...

Скарга

Мышка прыйшла да ката —
Паскардзіцца на жыццё:
— У нас ні зярнятка на зуб.
Калі ж шалупайку згрызу,
Дык радуюся: «Смаката!..».
А вы, Катафей, што ясцё?

— Што ёсць. Ды ўсё на замках —
Прысмакі вачыма жуём.
Нішто не трапляе да лап,
Каб даць смакату языкам.
Таму вось так і жывём,
Што ловім мышэй! —

І —
хап!..

Пра што падумалася ў электрычцы «Зялёнае — Мінск»

Чыгунка й тая кеміць, што і як:
Даўно ўжо не ганяе паражняк.
А мы з душой, далёка не чыгуннай,
Пустапарожніх слоў стагі стагуем.
На сенакосе аж пупы іржуцца.
Стагі ў нас тыя кнігамі завуцца.
Тамы пластуюцца, нібыта ў сенавалах,
Каб жыўнасць без харчоў не зімавала, —
Каровы сена малаком вяртаюць.

Але ж каровы кніжак не чытаюць...

Бацькі і дзеці

Перачытваючы І. С. Тургенева

Дэмакраты з дзяцінства ў абкама-
І райкамаўскіх лімузінах...
Нас аўто захапляла таксама:
Ах, дыхнуць бы дымком бензінным!..

Ды яшчэ шыкавалі мы ў чунях,
Змайстраваных з камер аўтобусных...
Пра такое ж і чуць-не-чулі,
Каб вось так, як па школьным глобусе,

Калясіць, нібы лёсам накрэслена,
З Крыма ў Юрмалу, з Юрмалы ў Сочы.
І ніхто, каб аднойчы падвезці нас,
З той дарогі не збочыў...

Да таго ж яшчэ й ладзілі кепікі:
— Эх вы цыпікі нехлямяжыя!..
Ды нагамі ў цыпках, парэпаных,
Мы, было, пад зад вам адважвалі.

А калі час прыслужваць заўпарціўся,
Тут жа ўміг памяняліся пацеры,
І ўжо новым аўтаалюрам
Скіравалі вы «націск і буру».

Ды не супраць яшчэ й папікацца
З галадранцамі з нейкіх мачулішчаў,
Што не выйшлі мы «властною статью»
І таму безнадзейна чуемся.

Што ж — кар'ерны запас не растрачаны
І такія ў вас крэўныя гены,
Што ад сыскі прыўладна-спадчыннай
Не адрэзаць і аўтагенам.

Дзякуй богу: я ў гэтым не геній, —
І скажу вам, сябры-фарысеі:
Мо й кульгалі кіроўчыя гены,
Але ўмею і жаць я — і сеяць!

Кайфір

Называў кефір кайфірам
І зусім не шкадаваў:
Чуць не чуў пра кайф, ды шчыра
Піў кайфір — і кайфаваў.

З чаго ж бо?..

Спазнаўшы гаспадарскі дрын,
Барбос штодня мудрэе:
«П'е бос з бутэлькі азвярын, —
З чаго ж бо так звярэе?..».

Пакуль не спытае...

Бяжым, бяжым...
Такі рэжым.

Самі не знаем,
Як і калі
Ў рэжымнай праграме
Сэнс набылі.

Бяжым паасобку
Адзіным кублом:
Слабейшы таропка,
Круты — напралом.
Хто стомятроўку,
Хто марафон, —
Самаўстаноўка?
Ці самапраклён?..

Стаім, сядзім,
Нават ляжым —
А ўсё бяжым.
Усе бяжым.
І правіць адзін
Усімі рэжым:

Бяжым,
Бяжым...

Пакуль не спытае
Аднойчы крыж:
— Хіба не знаеш,
Куды бяжыш?..

Нібы ў казцы...

Канцэртны абразок

Нібы ў казцы: луг сімфанічны
Рассцілае цудоўны абрус,
Кожным гукам расквечана кліча
Ў карагод летуценных муз.

Абуджаюць прастору валторны,
І з душы адмятаюць сон
Сотняй колераў непаўторных
Скрыпкі — сола і ва ўнісон.

У суладдзі трубаў свячэнне,
Флейтаў сонечны россып расы,
Пчолы ў кветках віяланчэляў,
А ў падгучча — чмялёў басы.

У званочкаў — блакіт нябесны,
З булькатаннем крынічным кларнет,
Барабанам вось трошкі цесна, —
Зрэшты, гэта ўжо ўсім не сакрэт...

І ад фальшу перасцярогай
Шасцікрыла ўзлятае рука:
Дырыжор — серафім ад Бога —
Да натхнення шлях адшукаў!..

***

Не схітраваць тут, не пацыркачыць:
Якой цаною ўзысці на неба? —
Кошт — для пачатку — зусім нязначны:
Каб уваскрэснуць — памерці трэба.

Пасылка

Каб дні не адзінока чуліся,
Каб не забыў, хто я такі, —
Мне пасылае Бог з Мачулішча
Зрэдзьчас у рыфму два радкі...

Сёння:

Усё, што здараецца, не паўтараецца,
Але да канца жыцця адгукаецца.

3 чэрвеня Васіль Васільевіч Зуёнак адсвяткаваў свой 85-ы дзень народзінаў. Шчыра віншуем выдатнага паэта, сябра Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў з пашанотным юбілеем, зычым бадзёрасці духу, добрага настрою, натхнення на творчую працу!



Барыс ПЯТРОВІЧ

Наіўны дэтэктыў

Урывак з аповесці

...Дзяўчаты ад Антося назаўтра не з'ехалі. Не так проста напрыканцы верасня знайсці ў Менску кватэру. Засталіся яшчэ на тыдзень-другі. Антось быў не супраць, разумеючы гэта. За той час, што ён жыў тут адзін, без сяброўкі, крыху і засумаваў па «опчаству». Дзяўчаты трымаліся сціпла, можна сказаць, строга. У сяброўкі да Антося не лезлі. Словам, ва ўсім адчувалася не толькі іх часовасць у яго, але стрыманасць, адасобленасць. Да таго ж імі першымі пачалі цікавіцца следчыя і выклікаць да сябе. Не сказаць, каб іх занеслі ў лік падазраваных, але з рахунку не скідвалі. Допыты рабілі і паасобку, і разам. Пэўна, хацелі падлавіць на нейкіх несупадзеннях у паказаннях. Але дзяўчаты дамовіліся казаць праўду і толькі праўду. Каб не заблытацца. Што было разумна ды правільна.

Антось сачыў з боку за тым, што адбываецца. І, хочаш не хочаш, паколькі быў уцягнуты ў разбіральніцтва і штодзень бачыў дзяўчат, прыкідваў свае версіі. Самазабойства і няшчасны выпадак следчымі пакуль былі адпрэчаныя. Хоць прысутнасць нейкага іншага чалавека падчас смерці бабулі ці адразу пасля ўстанавіць таксама не ўдалося. Але ж ён быў... Быў, аднак у кватэры адбіткаў пальцаў іншых людзей, апроч бабулі і дзяўчат, не знайшлі, а ў пакоі бабы Гені былі выключна яе сляды. На «хуткую» званілі з хатняга тэлефона, што ў пакоі бабулі. Гэта следчым было проста выявіць. Але адбіткаў пальцаў на ім не знайшлі — той, хто гэта зрабіў, акуратна выцер слухаўку. Хто мог быць у той дзень у кватэры бабулі? Дзяўчат варта выключыць, яны свае алібі даказалі — спачатку Антосю, а потым і следчым. Заставалася яшчэ вельмі шмат людзей, якія маглі быць падазраванымі і якіх следчым трэба было апытаць. Як Антосю падавалася, найперш гэта Толік. Потым студэнты, якія бралі ў бабулі грошы ў доўг. Пэўна ж, пра гэты пункт яе даходаў следчыя ўжо ведалі. Далей — кліенты, якія прыходзілі да яе і... да дзяўчат. Не да гэтых дзяўчат, што жылі цяпер у Антося — бабуля зусім нядаўна ўзяла іх на кватэру і толькі-толькі пачала абходжваць ды рыхтаваць да «працы», а ранейшыя... ці мала якія канфлікты маглі быць у іх... Ну і, нарэшце, жанчыны з Антосевага двара, і не толькі з яго, якія маглі яе прыраўноўваць да таго ж Толіка. І толькі потым варта было не выключаць і няшчасны выпадак...

Але Антось не пралічыў, што першым возьмуцца за яго...

Калі следчыя праглядалі, хто ў той дзень тэлефанаваў бабулі, яны заўважылі, што нехта даволі настойліва названьваў ёй некалькі разоў. І яна падымала слухаўку. Размова працягвалася то хвіліну, то трохі меней, то трохі болей. Устанавіць, хто і адкуль тэлефанаваў, цяпер вельмі проста. І аказалася, што званіў бабулі яе бліжэйшы сусед. Хто б вы думалі? Антось... Яго ўзялі проста з працы. Прыехалі два міліцыянты і на вачах усіх супрацоўнікаў арыштавалі. Скруцілі рукі за спіну, сагнулі ў саромную паставу ледзь не ракам і вывелі. Антось, агаломшаны нечаканкаю, не супраціўляўся.

Дапытвалі яго двое следчых. А час ад часу заходзіў трэці і строга пытаўся ў іх:

— Ну як, прызнаўся?

Антося ажно скаланала ад гэтага: у чым прызнаўся? Ён абсалютна невінаваты. Увесь той дзень праседзеў на працы. Выходзіў на Камароўку ў абед хвілінаў на пятнаццаць, купіць што-небудзь перакусіць. Нікому, ніякой бабульцы не тэлефанаваў...

— Не тэлефанаваў? — павышаў голас следчы. — А як тады маглі адбіцца званкі з твайго працоўнага тэлефона на тэлефоне суседкі? З твайго, чуеш?

— Не ведаю... — лепятаў Антось, бо і сапраўды не ведаў.

— Нехта з іншых супрацоўнікаў заходзіў у твой кабінет падчас рабочага дня?

— Канечне, заходзілі.

— Нехта з іх тэлефанаваў з твайго тэлефона?

— Здаецца, не. Не памятаю... Не...

— Ты з кабінета выходзіў?

— Выходзіў.

— Можа, у гэты час?

— Не ведаю... Можа быць...

Антось таксама вырашыў казаць толькі праўду, як і дзяўчаты. Тым болей ён жа ж то ведаў, што нікога не забіваў. І ўвогуле ніколі не пераступаў парог кватэры бабы Гені, пакуль не запрасілі быць панятым.

— Званкі былі пасля абеду. З чатырнаццаці да пятнаццаці трыццаці. Суседку забілі, па дадзеных экспертызы, у сямнаццаць дзесяць. Дзе ты быў у гэты час?

— Яшчэ на працы. Мы працуем да без пятнаццаці шэсць.

— Хто можа пацвердзіць?

— Ды ўсе.

— Мы гэта праверым...

Допыт быў перакрыжаваны. Пытанні задаваў то адзін следчы, то другі. Прычым ролі іхнія былі загадзя падзеленыя. Да прымітыўнага банальна: адзін быў строгім і пастаянна павышаў голас, ледзьве не крычаў на Антося, пры гэтым устаючы і ўзвышаючыся над ім. Другі казаў спакойна, міралюбіва, са спагадай да Антося, і нават нібыта спрабаваў суняць свайго калегу, калі той занадта распякаўся.

Зноў зайшоў трэці следчы.

— Ну як, прызнаўся?

— Не... — адказалі разам абодва дапытвальнікі.

— Што вы цягнеце? Канчайце хутчэй. Усё ж ясна ад пачатку. А не — дык у «стакан» яго — хай падумае там. І ўспомніць усё. Ці лепей — у камеру да крымінальнікаў. Апусцяць у пяць хвілінаў, і прызнаецца — дзе ён дзенецца... — грэбліва махнуў рукой: — Заканчвайце.

Пэўна, гэта быў іхні начальнік. Антось не ведае. Але пасля чарговага ягонага візіту змяніўся і той следчы, які быў лагодным ды спагадлівым. І ўдвох яны пачалі не проста пытаць у Антося, а крычаць і палохаць. Ён патрапіў з працы, са спакою і нармальнага жыцця, адразу ў гэты кабінет, пад такі перакрыжаваны допыт, і галава ў яго ішла кругам, думкі блыталіся... Не, сумнявацца ў тым, ён ці не ён забіў бабульку, Антось не мог. Ён цвёрда ведаў, што не ён. Прызнавацца яму не было ў чым. Але як маглі адбіцца званкі з тэлефона на тэлефоне бабулькі — ён не ведаў і патлумачыць не мог. А гэта была асноўная зачэпка з боку следчых... Няўжо і сапраўды нехта з калегаў заходзіў у ягоны кабінет і званіў. Але хто? Хто гэта мог зрабіць, падлавіўшы тыя маманты, калі Антось выходзіў? А выходзіў ён, зразумела, не раз. Не толькі да начальніка, але і па нейкіх асабістых справах. Хто? Хто? ХТО? Гэтае пытанне не давала Антосю спакою. Следчыя разышліся, крычалі. Палохалі. Тым, што яго зараз пасадзяць у камеру да крымінальнікаў. І крымінальнікі Антося ў момант апусцяць. Згвалтуюць. «Пеўням» зробяць... А можа, і заб'юць! Бо толькі і чакаюць свежага мясца. І крымінальнікам за тое нічога не будзе. Бо ўсе яны сядзяць па расстрэльных артыкулах. І следчыя яго не абароняць.

Антось слухаў і не слухаў іх, чуў і не чуў. І ведаў адно: суседку ён не забіваў...

— Не прызнаўся! — зноў зайшоў трэці следчы. — Канчайце з ім валаводзіцца, нах... У «стакан» яго, нах... Хай пасядзіць і падумае над сваім жыццём, нах...

«Стакан» аказаўся пакойчыкам... Не, гэта занадта... Шафкай менш чым метр на метр унутры, у якой можна было толькі стаяць ці прысесці наўколенцы. Дзверы за Антосем зачынілі, і ў «стакане» стала вусцішна цёмна. Ён паспрабаваў развярнуцца тварам да дзвярэй, зачапіў плячом халодную, мокрую, брыдкую сцяну... І гэта яго страсянула: бр-р-р... Ацверазіла і вярнула пачуцці. Хоць трохі. Не супакоіла, не. Але ахаладзіла. Бо там, у следчых, то быў экстрым яшчэ той. Калі б Антосю было ў чым прызнацца, то ён не ведае, магчыма, і прызнаўся б... Патрапіць са спакою свайго кабінета, з разняволенасці і ленасці, што была ў яго сёння на працы, адразу сюды пад такі прэс і вытрымаць той націск — не кожны зможа.

Колькі часу правёў у «стакане», Антось не ведае. Можа, гадзіны дзве, можа, больш. Аднак ужо праз некалькі хвілінаў ён сказаў сабе: «Антось, супакойся. Ты ведаеш, што ні ў чым не вінаваты. Але гэта трэба даказаць. Званілі з твайго тэлефона бабулі. Хто гэта мог зрабіць? Падумай...». І пачаў згадваць, хто ў той дзень да яго заходзіў. Потым адкінуў гэты занятак. Бо, хутчэй за ўсё, той, хто званіў, застаўся невядомым яму — ён заходзіў у кабінет тады, калі Антось выходзіў. А калі ён выходзіў? Не, у той дзень ён практычна не выходзіў з кабінета... Працы якраз было шмат, і Антось, амаль не адрываючыся, сядзеў за кампутарам. Ці ўсё ж выходзіў? Так, выходзіў. Толькі ў абед на Камароўку. Але званілі ж пазней... Калі ён там быў. Стоп... А куды ён сам тады званіў?.. І вось тут Антось згадаў, куды званіў у той дзень сам...

Справа ў тым, што на Камароўцы яму нешта прыспічыла забегчы ў прыбіральню: жывот ні з таго ні з сяго схапіў. Пакуль ён быў у кабінцы, разглядзеў дзверы. На іх было дзясяткі розных надпісаў. Ад проста імёнаў, розных непрыстойных словаў з малюнкамі да цэлых вершаў. Запамінальных амаль адразу твораў туалетных паэтаў. Сярод іх былі і вельмі дасціпныя. Антося зацікавілі, зразумела, найперш гэтыя вершыкі. І паколькі, не паверыце... але ў падобнай грамадскай прыбіральні ён быў фактычна ўпершыню, то знайшоў там сабе шмат займальнага. Бо звычайна ў прыбіральнях кавярняў, рэстарацыяў, куды ён ходзіць, і тым больш на працы такіх надпісаў няма: там чысценька і прыстойненька. А вось на рынку, на вакзалах хапае — традыцыі, закладзеныя яшчэ ў савецкія часы, жывуць, колькі тыя надпісы ні стараюцца зафарбаваць... Падсумоўваў усе вершыкі на дзвярах прыбіральні адзін: «Сярод дзярма вы ўсе паэты, сярод паэтаў вы дзярмо...». І было там яшчэ шмат нумароў тэлефонаў з «рэкламнымі» прыпіскамі: «Хочаш па...(трахацца) — звані...», «Адса...у» ды інш. І адзін незвычайны: «Абмен: 2=3». І нумар тэлефона. Нехта мяняе двухпакаёўку на трохпакаёўку, адразу падумаў Антось. Адразу, бо ён якраз і шукаў падобны абмен. Два пакоі на тры — гэта ж тое, што яму неабходна... Тут варта сказаць, што ён ужо здаволіўся сваёй кватэрай, што дасталася яму ад бабулі Ганны. Такая вялікая яму не была патрэбная. Пакоі ўсё роўна пустуюць. І ён вырашыў памяняць яе на меншую. З даплатай, вядома. А за даплату набыць машыну. Ужо і паралельна на адным сайціку нагледзеў файную «БМВ» пятую... Правы ў яго былі, ён здаў на іх яшчэ ва ўніверсітэце. Што кватэра... Яму і двух пакояў хопіць. А машына — гэта воля. Паездзіць па Беларусі. Наведае Мір, Нясвіж... Ды што — проста рване да возера любое, да ракі, на прыроду... Да вогнішча. Намёт. Рыбалка. Юшка. Шашлык... Мілата! Можна аднаму. А можна і з сябрамі, у якіх машыны няма... І Антось пачаў шукаць абмен. Але нічога добрага не знаходзілася. Ён не хацеў з'язджаць з цэнтру і далёка ад бацькоў, а прапановы з добрай даплатай былі ў асноўным з ускраінаў, з-пад кальцавой... А на гэтых дзвярах нумар тэлефона быў амаль такі ж, як і Антосеў хатні. Адрозніваліся толькі дзве апошнія лічбы. Значыць, хутчэй за ўсё, кватэрка абменная з ягонага раёна, мажліва, і зусім блізка ад яго дома. Чаму б не паспрабаваць. А раптам... Запісваць тэлефон Антось не стаў, запомніў толькі дзве апошнія лічбы, адрозныя ад ягоных тэлефонных: 41. Лёгка запомніць: пачатак Вялікай айчыннай...

Прыйшоўшы на працу, Антось адразу набраў гэты абменны нумар. Доўга ніхто не адказваў. Потым гудкі сціхлі — слухаўку на тым канцы «дрота» паднялі. І цішыня. Ні «ало», ні «слухаю»,

Фота www.liter.kz

ні «добры дзень» у адказ, як звычайна бывае... Цішыня тая і Антося напружыла. Што казаць? Як правіла, першым гаворыць той, каму тэлефануюць. Калі не звычайныя словы, дык, як часам бывала: «Хто там?» ці: «Хто вам трэба?», — на што адразу ж хочацца нагрубіць: «А вам хто?»... А тут цішыня... Антось паслухаў-паслухаў тую глыбокую цішыню і паклаў слухаўку. Падумаў, што памыліўся нумарам. Праз нейкі час ён зноў набраў той нумар, на гэты раз ужо адсочваючы кожную лічбу, каб не памыліцца. Вынік быў той жа. Толькі гэтым разам слухаўку паднялі амаль адразу. І ні слова. Цішыня... Зноў цішыня. Пэўна, проста сувязь абрываецца. Зрыў на лініі. Антось паклаў слухаўку. Выправіў нейкі тэкст, што даслалі на вычытку. Пераслаў назад. Потым яшчэ нешта зрабіў і згадаў пра тыя званкі. Яны яго трохі заінтрыгавалі. Што за цішыня? Набраў нумар. Слухаўку паднялі. Цішыня. Ён услухаўся ў яе. І пачуў рып скуры — чалавек, які падняў слухаўку, відаць, сядзеў у скураным крэсле, і скура пад ім ціхенька парыпвала. Потым ён пачуў нават лёгкае дыханне ў трубку — пасопванне. Антось разгубіўся і паклаў слухаўку. Што такое? Няўжо нейкі «таварыш маёр» падключаецца да лініі, каб слухаць ягоныя размовы... і тым самым перапыняе сувязь з іншым абанентам, — такога ў яго яшчэ не было... Ад такіх думак Антося нават трохі ў пот кінула. Навошта яго слухаць? Ён жа не апазіцыянер нейкі. Не тэрарыст. Ну схадзіў на пару мітынгаў пасля выбараў — дык разам з усімі. Там тысячы былі... І што — усіх узялі на заметку і слухаюць? Дай яшчэ раз паспрабую пазваніць. Набраў нумар. Паднялі. І цішыня. Услухаўся. Тое ж асцярожнае парыпванне скуранога крэсла. Лёгкае, ледзь чутнае дыханне. І маўчанне. Нібыта чаканне, што першае слова прагучыць ад яго, Антося. Нейкі пароль, падумалася. Ці ўмоўны знак... Во ўляпаўся дык уляпаўся... Антось асцярожненька паклаў слухаўку. І болей не званіў па тым нумары. Усяго званкоў было чатыры...

Толькі цяпер, у «стакане», ён зразумеў, куды тэлефанаваў. Так, ён тэлефанаваў бабулі Гертрудзе. І яна падымала слухаўку. І гэта яна рыпела тым скураным фатэлем, які Антось бачыў у яе пакоі. І гэта яна чакала нейкага ўмоўнага слова. А ён, разгубіўшыся першы раз, маўчаў і потым. Цікава, а калі б ён сказаў, што звоніць па аб'яве, убачанай у туалеце, што б яна адказала? Ці прамаўчала б... «Дарэчы, — падумаў Антось, — няўжо яна збіралася памяняць сваю кватэру на большую? Навошта ёй адной... Цяпер не даведаешся. Пачакай... Пачакай, Антосік... Ты ж ужо дакладна ведаеш, што да яе хадзілі мужчыны. Не толькі Толік. Магчыма, і па гэтай аб'яве з прыбіральні. Але што маглі значыць тыя словы: «Абмен... 2=3...». Што за абмен такі і што значыць — 2 раўно 3, калі гэта не абмен, а аб'ява для мужчынаў, такая ж, як іншыя, што я бачыў у прыбіральні... Не, 2=3 — не можа быць. Нават для мяне занадта незразумелая камбінацыя дзеля канспірацыі... Зрэшты, якая цяпер розніца. Галоўнае, згадаў, куды званіў у гэты дзень. Засталося толькі, каб следчыя пацвердзілі, што той нумар — нумар тэлефона бабулі Гертруды (у чым я амаль не сумняваюся, і ўсё ж...), а не нейкага там «таварыша маёра»...».

Прайшло яшчэ трохі часу, шкрабнуў ключ у замку, і дзверы «стакана» расчыніліся. Антось прымружыўся ад даволі цмянага святла ў калідоры, але яркага для яго пасля суцэльнай цемры, пра якую ён забыўся зусім, заняўшыся думкамі. Бо, калі ўспамінаў, нібыта бачыў перад сабой, як на экране, тыя дзверы ў прыбіральні з надпісамі, чытаў іх, бачыў свой кабінет і сябе ля тэлефона...

Антося адвялі да тых самых двух следчых.

— Ну што, як табе наш курорт? — пажартаваў лагодны.

— Прызнанне змякчае віну, — строга дадаў жорсткі. — Расказвай, ці ўспомніў што.

— Успомніў...

Следчыя ажывіліся:

— Што?

— Гэта я тэлефанаваў са свайго нумара...

— Ну-ну... — падахвоцілі, ледзь стрымліваючыся і, пэўна, паціраючы рукі пад сталом.

— Я тэлефанаваў па вось такім нумары, — Антось назваў яго, — не ведаю, ці гэта нумар суседкі, але ў той дзень я па ім тэлефанаваў. Некалькі разоў.

Следчыя не пацвердзілі, што гэта нумар бабулі Гертруды, і Антось працягнуў — расказаў, дзе ўбачыў гэты нумар і пра цішыню ў адказ на ягоныя званкі. І пра тое, што хоча памяняць кватэру і ў апошнія дні шмат каму тэлефанаваў з пытаннем пра абмен, і гэта таксама можна праверыць...

Следчыя выслухалі ўважліва, і было відаць, як паступова твары іхнія губляюць цікавасць да таго, што ён расказвае. Гэта было не прызнанне. Гэта было спробай знайсці тое самае алібі, апраўданне сабе. А ці ж гэта ім трэба было...

— Добра... — сказаў лагодны. — Яшчэ раз: дзе ты ўбачыў нумар тэлефона і надпіс.

— У грамадскай прыбіральні на Камароўцы. Кабінка па ліку, здаецца, трэцяя ад уваходу.

— Мы праверым.

Пераглянуліся. Што рабіць? Зноў адпраўляць Антося ў «стакан»? Ці адразу ў тую камеру, дзе яго «пеўням» зробяць? Не, пакінулі ў сваім кабінеце. Лагодны ўстаў і выйшаў. Яны засталіся з жорсткім сам-насам. Той маўчаў. Трымаў асадку ў руках, якую падрыхтаваў пад запіс Антосевага прызнання, і круціў яе то каўпачком уверх, то ўніз, пастукваючы па стале. Быў канец дня. Магчыма, ужо і зусім позна — час Антось дакладна не ведаў, але прыкідваў, што недзе гадзінаў сем-восем вечара. Жорсткі, відаць, таксама стаміўся. Антось у іх мог быць не адзін, а цэлая «карусель» такіх, як ён, «злачынцаў» сёння тут круцілася.

Лагодны вярнуўся хвілінаў праз дваццаць ці трыццаць. Таксама стомлены.

— Мы стэлефанаваліся з аддзелам міліцыі на Камароўцы. Яны схадзілі ў прыбіральню і сфатаграфавалі тыя дзверы. Здымак пераслалі. Вось ён, — паказаў на сваім мабільніку напарніку. — Надпіс там ёсць. І такі, як вы казалі: два раўно тры... — ён адразу перайшоў на «вы», і Антось нібыта асунуўся, аслаб, на яго навалілася ўся стома гэтага дня і ўся нярвовасць апошніх гадзінаў... Лагодны падышоў да стала, адарваў нейкую паперку, чыркануў на ёй некалькі словаў, падаў Антосю:

— На сёння вы свабодны. Просім прабачэння за затрымку.

Антось ледзь падняўся. Галава кружылася. Падалося, што вось-вось яго выверне, і ён званітуе проста ў гэтым кабінеце на стол і паперы следчых.

— ...Але... — спыніў яго следчы, — ...мы да вас будзем яшчэ звяртацца. Дзякуй за супрацоўніцтва.

Нічога сабе супрацоўніцтва. А што было б, калі б Антось, застрашаны і запалоханы, не згадаў пра тую прыбіральню...

Дамоў з аддзялення ён пайшоў пешкам. Калі б хто з ягоных знаёмых пабачыў яго ў той момант, ён бы сам страціў прытомнасць ад аднаго выгляду Антося.

Ён выйшаў з будынка на вуліцу галоўнага менскага міліцыянта Фрунзэ. Былі ўжо прыцемкі. Дамоў ісці адразу не хацелася. Вочы блукалі па наваколлі, па дрэвах і дамах, але ў свядомасці нішто не адбівалася. Галава была нібы набітая ватай. У вушах стаяў і не праходзіў крык: «Ну што, прызнаўся?»... Каб паспрабаваць скінуць з сябе ўвесь цяжар, усю пошласць, што сабралася за паўдня ў пастарунку, ён вырашыў прагуляцца па вуліцах Менску, але пайсці дахаты не наўпрост, а так, як павядуць ногі. Ён любіў аддавацца на волю ног, асабліва ў лесе, у грыбах. І заўсёды, нават з незнаёмых мясцінаў, вяртаўся з поўным кошыкам... Антосю падабаўся вячэрні Менск — ён падаваўся яму нашмат прыгажэйшым, чым дзённы ці ранішні. Бо ўдзень вельмі часта над горадам вісяць хмары ды шэрань, і калі палічыць сонечныя дні, дык іх у Менску будзе менш, чым у знакамітым сваімі туманамі Лондане. А вечарам, калі запальваюцца ліхтары, горад заўсёды прыгожы, няважна, было сонца ўдзень ці не. Антось памкнуўся было пакрочыць у бок плошчы Перамогі, але спыніўся, і ногі павялі яго проста ў парк Горкага. Азірнуўся на велічны будынак следчага камітэта і падумаў, што Дзяржаўны музей гісторыі Беларусі глядзеўся б у ім значна лепш, чым гэты камітэт. Але — планавалі, рамантавалі, ды музею не аддалі... Па дзіцячым парку прайшоў да цырка, ловячы тварам лёгкі вячэрні халадок і ўнюхваючыся ў прыемную сырасць першага апалага лісця. Ля ракі нядаўна падкасілі газон, і водар падвялае за дзень травы адкінуў яго ў мройлівы ўспамін, у лета, на лецішча бацькоў... Узышоў на масток праз Свіслач, пастаяў на ім, гледзячы, як пеняцца і мкнуць наперад хвалькі вадаспадзіка, паназіраў за адзінокім рыбаком, што выхапіў з ракі нейкую рыбінку і шчасліва зыркнуў на яго; абмінуў недабудаваную гаргару, цырк і звярнуў да помніка Янку Купалу. Пасядзеў трохі каля ног народнага паэта. Згадаў, што і ён нібыта паэт ці празаік. Творца, словам. Нават скончыў Школу маладога літаратара пры Саюзе беларускіх пісьменнікаў. Успомніў, як на адзін з першых заняткаў прыходзіў старшыня гэтага Саюза і казаў, па вялікім рахунку, правільныя рэчы, якія здаваліся ім, навучэнцам, банальнымі. Што навучыць пісаць немагчыма, а можна толькі навучыць, як не трэба пісаць, каб не рабіць тыя класічныя памылкі, праз якія праходзяць усе пачынаючыя. А далей усё залежыць ад таленту і працаздольнасці: мазалёў на адным месцы. Маўляў, геній — гэта адзін працэнт таленту і дзевяноста дзевяць — працы... У Антося, пэўна, быў толькі адзін той працэнт. Бо тэксты ягоныя хвалілі, а кнігу ён так і не дапісаў, хоць і пачаў складаць у школе. Магчыма, яшчэ вернецца да яе. Там не раман, які патрабуе асаблівай уседлівасці і — мазалёў... Там кароткія апаведы, якія можна выдаваць у любой колькасці. Можна дзесяць, і кніга будзе маленькай. А можна чакаць, калі збярэцца трыццаць, сорак, ды так і не дачакацца... Тут, каля помніка Купалу, перажыўшы такое выпрабаванне, Антось урачыста паабяцаў сабе, што абавязкова вернецца да кнігі, дапіша яе і ўставіць туды аповед пра сваё знаходжанне ў «стакане»... З купалаўскага скверу Антось пайшоў на набярэжную Свіслачы, гуляць па якой таксама любіў. Размінуўся з двума-трыма раварыстамі, якія пранесліся каля яго, як вецер, і вырашыў падняцца да кавярні «Грай», дзе апошнім часам ладзіцца шмат літаратурных імпрэзаў. Кавярня была адчыненая, і там нешта адбывалася, але Антосю не захацелася ісці ў тлум памяшкання. Пасля «стакана» ў яго была не тое каб клаўстрафобія, а проста жаданне бачыць неба над галавой. Высокае, вольнае неба. Шкада толькі, што ў цэнтры Менску яно амаль заўсёды бяззорнае. Антось звярнуў у тлум вуліцы Зыбіцкай. Яна аглушыла яго — яна гуляла, яна крычала, яна спявала. Купкі моладзі, а Антосю падалося — натоўпы, блукалі ўздоўж яе ўзад-уперад, заходзілі ў шматлікія кавярні, проста стаялі і весела балбаталі. Не зважаючы ні на кога, ён, можна сказаць, прабег праз гвалт і вэрхал Зыбіцкай, перайшоў праз мост Свіслач і апынуўся ў Траецкім. Пахадзіў між будынкаў, няспешна прайшоўся ад букіністычнай кнігарні «Вянок», якая ўжо была зачыненая, да музея Багдановіча, дзе таксама адбывалася нейкая вечарына і маглі быць ягоныя знаёмыя. Павольна пакрочыў у глыб дамоў — тут была такая неверагодная цішыня, ажно не верылася, што ён знаходзіўся ў цэнтры вялізнага мегаполіса. Зноў выйшаў да набярэжнай Свіслачы, амаль да Вострава Слёз, спусціўся да вады змачыць твар, і да яго адразу кінулася некалькі заўсёдных тут дзікіх гарадскіх качак, прыкормленых пенсіянерамі, нахабных і патрабавальных. Антосю не было чаго ім кінуць. У думках ён папрасіў у качак прабачэння, што яны, убачыўшы яго, падмануліся... Праз Траецкае прадмесце вярнуўся ў стары горад да Ратушы. Пасядзеў у вазку, запрэжаным у двойку бронзавых коней. Не дзеля здымку, як робяць гэта турысты, а так... асалавела гледзячы на тых, хто спыняўся і чакаў, калі ён сыйдзе з вазка, каб сфатаграфавацца. Паслухаў перазвон на Кафедральным саборы і ад Ратушы, міма саркафагу, выйшаў на праспект. Але далей пакрочыў не па ім, а па вуліцы Энгельса, паўз знакаміты скверык з прыбіральняй-касай Купалаўскага тэатра, вырушыў на вуліцу Карла Маркса, якая так і не стала пешаходнай. А потым, мінуўшы Мастацкі музей, прайшоў паўз некалі свой філфак і павярнуў да аднаўленага стадыёна «Дынама». Не зазірнуў да яго, як звычайна, і не пасядзеў, як рабіў у дзяцінстве, нават калі футбола не было, а праз скверык, ужо амаль у цемры, асветленай рэдкімі жоўтымі плямамі ліхтарняў, увайшоў у свой двор. Падняўся ў кватэру і, не распранаючыся, упаў на засланы ложак ды заснуў сном мярцвецкі, жахліва, смяртэльна стомленага чалавека...

Кнігі Васіля Быкава ў электронным і аўдыёфармаце

У межах праекта «Лета з Быкавым», запачаткаваным Саюзам беларускіх пісьменнікаў і Kniharnia.by, тры аповесці класіка нацыянальнай літаратуры Васіля Быкава «Бліндаж», «У тумане» і «Пакахай мяне, салдацік» з'явіліся ў папулярных аўдыёфарматах (у тым ліку для iPhone, iPod, iPad).

Да ўсяго, чытачы могуць знайсці ў электронным фармаце ўсе выдадзеныя Саюзам беларускіх пісьменнікаў тамы з Поўнага збору твораў Васіля Быкава, а таксама яго зборнік-білінгву «Парадоксы жыцця» (па-беларуску і ў перакладзе на рускую мову Ірыны Шаўляковай).

На сайце Саюза беларускіх пісьменнікаў lit-bel.org можна бясплатна паслухаць першыя пяць раздзелаў кожнага з твораў Народнага пісьменніка Беларусі — раздзел «Бібліятэка / Аўдыёкнігі», а ў раздзеле «Бібліятэка / Электронныя кнігі» бясплатна спампаваць тэксты кніг.

Дабраслаўленне

Марына ЦВЯТАЕВА (1892–1941)

* * *

Нашы душы ці звыкнуцца,
што расстаёмся з табой мы? —
Адгукаюцца лопатам крылаў
зіхоткіх сваім.
Расшчапіў нехта вышні пяшчотныя
нашы абдоймы,
Памяць душаў забыўшы пры тым.
Кожны вечар запалены ў нас
чараўніцай рахманай,
Кожны вечар, калі над гарамі
ды ў сэрцы туман,
Да ўсёпомнай душы падыходзіць
хадою ціхманай
І няпэўнай — ранейшы падман.
Быццам вецер, што рвецца ды ўсцяж
абуджае былое,
Ты з бліскучых радкоў зноў і зноў
усміхаешся мне.
Ўсё дазволена, ўсё! Не для нас —
асуджэнне тугою:
Ты — ад сну, я — у сне…
Нехта вышні сказаў:
з невымоўна-няяснай тугой мы
Мусім жыць (будзе безліч блуканняў
між зимроку й зімы!)
Расшчапіў нехта вышні пяшчотныя
нашы абдоймы…
Ў тым не вінныя мы!

<1910>

* * *

Падобны, як я, ідзеш ты,
Вачэй не ўздымаеш, так,
І я так рабіла, зрэшты!
Спыніся цяпер, мінак!
Чытай — казяльцы ў букеты
І макі сабраўшы зноў:
Марына — імя маё гэта,
Мне столькі й столькі гадоў.
Не думай, што тут — магіла,
Пагрозы ўсе ад мяне…
Смяялася я штосілы,
Хоць нельга было так, не!
І кудзеры так віліся,
У твар біла кроў няўзнак…
Была я таксама, спыніся,
Спыніся цяпер, мінак!
Сарві, сабе пажывіцца,
І ягаду, і сцябло —
Няма ад цвінтарных суніцаў
Смачнейшых — і не было.
Ды толькі не стой, не вохкай,
Хай роспач цябе абміне,
А проста падумай лёгка
І так забудзь пра мяне.
Не ведаюць промні межаў!
Ты ў пыле ўвесь залатым…
— Хай голас мой не бянтэжыць
Гучаннем падземным тым.

3 траўня 1913
Кактэбель

* * *

І колькі іх упала ўжо ў цясніну
Адтуль, дзе ўсе былі.
Дзень прыйдзе той, калі і я пакіну
Навек абсяг зямлі.
Застыгне ўсё, што білася ў істоце,
Пяяла, як грамчэй:
У зіхаценні кос, у слоў пяшчоце,
У зелені вачэй.
Прадоўжыцца жыццё з яго
надзённым хлебам,
Што з плынню дзён сплыло,
І будзе ўсё — нібы пад гэтым небам
Мяне і не было!
Той зменлівай, як дзеці, ў кожнай міне,
Злой напаказ.
Калі ўзнік з дроваў попел у каміне,

Быў мілы час.
Віяланчэль і вэрхал кавалькадны,
І звон сярод сяла…
— Мяне, такой жывой, такой сапраўднай,
Што на зямлі жыла!
Да ўсіх вас — я ж ні ў чым не знала меры:
Чужы вы свой?! — ізноў
Звяртаюся з патрабаваннем веры
І з просьбай пра любоў.
І ў дзень, і ў ноч, і вусна, і пісьмова:
Да згод і да нязгод,
За тое, што мне сум прыносяць словы,
Што ма́ю дваццаць год.
За крыўды ўсе я прабачаю ўпотай
І не планую кар,
За ўсю маю нястрымную пяшчоту
Ды надта горды твар.
За хуткасць тых падзей, што шкодзяць
міру,
За праўду, за гульню,
За тое, што памру, мяне любіце шчыра —
Што я вам не зманю.

8 снежня 1913

Бабулі

Цвёрды і выцягнуты авал,
Раструбы чорнай сукенкі…
Юная бабця! Хто ў вас цалаваў
Вуснаў напышлівасць пекных?

Рукі, што ў залах палаца не раз
Вальсы Шапэнавы гралі,
Кудзеры твар аблямоўвалі ў вас,
З выгляду быццам спіралі.

Цёмны, пранізліва-строгі пагляд,
Да абароны гатовы.
Гэтак жанчын выглядала няшмат —
Юная бабка, дык хто вы?

Ў прорву магчымасцяў колькі сышло
І немагчымасцяў — з імі,
Полька, якой дваццаці не было,
З талентамі такімі!

Дзень быў цнатлівы, свяжэлі вятры,
Зоркі ў нябёсах паснулі.
Прага да бунту дайшла з той пары
Ці не ад вас мне, бабуля?

4 верасня 1914

* * *

Хачу я пры люстэрку — сон
і мутнасць там яшчэ —
Спытаць аб мэце вашых дзён
І аб прыстанішчы.

Вось, мачта цягнецца да хмар,
Вы — сярод палубы.
Вы — ў дыме цягніка. Абшар
Засмучаны намала быў.

Цяпер ён росны ўвесь такі,
Крук — над зяленівам.
— Дам на чатыры ўсе бакі
Дабраслаўленне вам.

3 траўня 1915

Пераклаў з рускай Лявон Баршчэўскі

Абрыс

Нэлі ЗАКС (1891–1970)

Спакой

Яблыкі падаюць долу між летніх прысад —
гэткі зялёны ў самотную смерць зарапад,
дрожкі жалобныя грукаюць па камянях,
ціха праводзяць парэшткі ў апошні шлях
спакой.

Тужыць вада наўздоўжкі канаў-каляін,
дзікія кветкі навокал, як скопішча мін.
І матылька, што над полем лятаў
бульбяным,
сном ахапіў сусветным і сном тым зямным
спакой.

Зумканне пчол, і крыніцы ўжо досыць было
шчасця; як іншага свету святло —
у цыркуноў гамане.
Певень да рання замоўкне і адпачне —
спакой.

1929

* * *

Ноч, ноч,
каб ты ў аскалёпкі не ператварылася
цяпер, калі час з шалёным сонцам
пакутніцтва
знікае пад пучынай мора ў тваёй глыбіні —
поўні смерці
у маўчання твайго кроў пралітую
цягнуць дах зямлі, які абрынаецца —

Ноч, ноч,
калісьці была ты нявестаю таямніц,
аздобленай атрутнымі лілеямі —
у тваім цёмным шкле пабліскваla
фата-маргана поўных тугі,
і любоў сваю ранішнюю ружу

выстаўляла табе, каб яна расцвітала —
ты бывала часам відзежаў люстрам
патойбочным і ротам-аракулам…

Ноч, ноч,
цяпер ты зрабілася
могілкамі жахлівай катстрофы зоркі —
бязмоўна час у табе парынае
са сваім знакам:
камень, што абрынаецца,
і з дыму штандар!

* * *

Калі пусцее дзень
у сутонні,
калі пачынаецца час без выяваў,
злучаецца галасоў самотнасць —
звяры толькі палююць
або палююць на іх —
ад кветак водар адно —
калі ўсё зноў безназоўнае,
як у самым пачатку —
ты ідзеш сярод катакомбаў часу,
што адкрываюцца тым,
каго вось-вось чакае канец —
там дзе растуць зародкі сэрцаў —
у цёмную сутнасць жыцця
парынаеш ты —
ужо як смерць абмінеш,
што адно толькі рэзкі скразняк —
і, мерзнучы каля выхаду,
расплюшчваеш вочы,
у якіх ужо водбліск свой
пакінула зорка новая.

Матылёк

Які ладны Той Свет
намаляваны ў праху тваім.
Праз полымнае ядро зямлі,
праз яе каменныя абалонкі,
ён быў табе ўручаны,
тканка росстані ў прошласцяў маштабе.

Матылёк,
дабранач усіх істотаў!
Вагі смерці й жыцця
схіляюцца сваімі шалямі
ўніз да ружы,
што вяне, калі на шляху дадому
спее святло.

Які ладны Той Свет,
намаляваны ў праху тваім.
Які каралеўскі знак
у таямніцы паветра.

* * *

Анёл скамянелы
яшчэ сцякаючы кроплямі ўспаміну
пра колішні сусвет
без часу
блукаючы па жаночым аддзяленні
у бурштынавым святле
уключна з наведваннем голаса
дагістарычна
не адкусіўшы ад яблыка
спяваючы на золку
ад праўды…

А іншыя расчэсваюць валасы
ад няшчасця
і плачуць
калі крумкачы знадворку
разгортваюць сваю чарнату ў поўнач.

Абрыс

Тое ўсё па-за мною ўжо —
ты адляцела разам з маім светам
Камета Смерці
па-за мною ўжо абдыманне
пустэчы
кружлянне пярсцёнка
што страціў свой палец…

Ізноў чарната і змрок
як перад стварэннем свету —
Закон Жалобы.
Апалага лісця легкадумная пазалота
начы
якую сабе дазволіў дзень.

Цень, каліграфія
як спадчына.

Маляваныя зеленню краявіды
з шаптаннем іх водаў-віражбітак
што патанулі
ў тупіковых завулках цемры.

Ложак крэсла і стол
на дыбачках вымкнулі з пакоя
пасля валаска расстання.

Усё адправілася ў вандроўку
разам з табой
усё што я мела ў мяне адабралі —

толькі ты мой каханы п'еш
словы з майго подыху
покуль я не замоўкну навекі…

Пераклаў з нямецкай Лявон Баршчэўскі

Партрэты і ўспаміны

Мікола ЯЦКОЎ

Мінскі здымак

Гэтае імя для мяне заўсёды гучала магічна. Бо здавалася, што паміж словамі «Брыль» і «Брылі» (вёска Брылі Магілёўскага раёна. — Рэд.) існуе не толькі аднакарэнная сувязь. І аднойчы лёс скрыжаваў нашыя шляхі, падарыўшы мне незабыўную сустрэчу з гэтым цудоўным чалавекам.

У ліпені 2001 года ў Мінску адбываўся трэці З'езд беларусаў свету, куды я быў запрошаны ў якасці дэлегата. Паміж паседжаннямі ўзнік перапынак, і было вырашана наведаць помнік Янку Купалу каля яго Дома-музея.

Апынуўшыся там, сярод сяброўска-святочнага тлуму, я раптоўна збоку адчуў хвалю нейкага спакою і ўпэўненасці. Павярнуў галаву і ўбачыў каржакаватую, моцную постаць Янкі Брыля. Ён стаяў, склаўшы рукі за спіной, і аб нечым думаў. І невядомая сіла падштурхнула мяне да гэтага чалавека: «Іван Антонавіч! А ці можна з Вамі сфатаграфавацца?». Брыль усміхнуўся і адразу ж згадзіўся. Побач праходзіў вядомы наш фатограф Анатоль Кляшчук, які і спыніў гэтае імгненне. І ў мяне з'явілася адчуванне подыху гісторыі, бо апынуўся я ў атачэнні двух волатаў беларускай літаратуры — Янкі Купалы і Янкі Брыля.

А потым з Іванам Антонавічам мы некалькі хвілін размаўлялі. Калі я назваў сваё прозвішча, ён не адразу, але ўспомніў, што чуў неадназова па радыё песню «Я разумею» ў выкананні Нэлі Багуслаўскай і што мая музыка там добра сплялася са словамі Генадзя Бураўкіна. Даведаўшыся, што я з Брылёў і жывуць там брылёўцы, Брыль адразу засмяяўся і пажартаваў наконт таго, што вось цэлую вёску назвалі ў яго гонар. І чамусьці ўспомніў аднаго з былых кіраўнікоў Беларусі, Ціхана Кісялёва, які аднойчы вёў нудную нараду рэспубліканскага актыву пра неабходнасць карэннага павышэння надоеў малака і закончыў яе так: «Словам, паважаныя таварышы, каб малака было больш, карову трэба карміць, паіць і даіць!»… На такой гумарыстычнай ноце мы ў той дзень і развіталіся.

Нязгаслая зорка

Анатоль Пятровіч Грыцкевіч напрыканцы 1970-х быў маім выкладчыкам у Мінскім інстытуце культуры, і маё імкненне да гістарычнага мінулага маёй краіны няўмольна пацягнула мяне да гэтага чалавека. З ім было неабсяжна цікава: я распытваў, а ён адказваў — змястоўна, глыбока і дабразычліва. І заўсёды адчувалася ў ім нешта такое, чаго не было ў звычайнага савецкага чалавека, — нашмат пазней я даведаўся пра шляхецкую славутасць роду Грыцкевічаў, да якога належыў Анатоль Пятровіч. І менавіта на гэтым яскравым прыкладзе я зразумеў формулу «Гены пальцам не задавіш» і тое, што шляхецтва — гэта, перадусім, вялікая адказнасць перад продкамі і сваім сумленнем.

Фота www.vchaspik.ua

А потым былі шматгадовыя ліставанні і віншавальныя паштоўкі. Зрэдку даводзілася нам сустракацца — і тады мы гаманілі і гаманілі.

Анатоль Пятровіч быў сумленнем свайго часу і тым вяхаром (з нешматлікіх), які стойка трымаў удары лёсу, захінаючы нас ад нягод. Ён быў Настаўнікам — менавіта з вялікай літары.

З ім было светла, цёпла і ўтульна. І гэта адчуванне засталося. І мне сёння ўспамінаецца віншавальны верш, які я калісьці прысвяціў Анатолю Пятровічу:

Звычайны дзень напрыканцы дваццатых
на нашым небе зорку запаліў.
Мы на яе праз цемнату і краты
глядзім — і нейкі чуем пераліў,
і нейкае на сэрцы варушэнне,
і памяць пачынае гаварыць…

З'яўляюцца забытыя імгненні,
цьвярдзеюць беларускія карэнні
і нават адыходзяць уяўленні.
А зорка тая
ўсё ярчэй
гарыць.

І няхай ніколі не згасае зорка Анатоля Грыцкевіча!

Жаданне разумець

Гэтага чалавека ведаюць усе: вось ужо некалькі дзесяцігоддзяў з экранаў беларускага тэлебачання кожны вечар маленькіх беларусаў вітае бессмяротная «Калыханка»: «Доўгі дзень, цёплы дзень адплывае за аблокі…» Словы гэтыя напісаў паэт Генадзь Бураўкін. Яны светлыя і чыстыя. Яны вельмі спеўныя. Шмат беларускіх кампазітараў заўсёды вельмі пільна ўглядаюцца ў вершы Генадзя Мікалаевіча.

І мяне не абмінула гэтае хваляванне: слухаць меладычнае гучанне бураўкінскіх вершаў і занатоўваць іх на нотных аркушах. А потым адбылося скрыжаванне нашых жыццёвых шляхоў, і сонечным віхрам нас падхапіла прыязнае сяброўства.

З Бураўкіным было заўсёды цікава. Ён усё разумеў. У вачах ягоных заўсёды хаваліся хітрыкі іроніі і ласкавасці. Але, калі справа даходзіць да прынцыповых момантаў, то гэтую гранітную непахіснасць няможна было ўзяць аніякім дынамітам. Прынцыпы ў Бураўкіна простыя: шанаваць Мову і Айчыну, не здраджваць, і — каб беларусы людзьмі зваліся.

Генадзь Бураўкін — не акопны паэт. Ён не хаваўся за брустверамі і надаўбнямі — кожны раз падымаўся ў атаку. І ведаючы, што сэрца можа не вытрымаць, усё роўна імкнуўся наперад — каб захінуць праўду і абараніць гонар.

А я вельмі ганаруся, што ў россыпу нашых песен таемна і непаўторна зіхаціць «Я разумею…». І прыгожа на сэрцы ад хвалявання Нэлі Багуслаўскай — першай выканаўцы гэтай неўміручай песні. А ў памяць назаўсёды ўрэзаўся ўспамін Нэлі Захараўны пра тое, як манахі Жыровіцкага манастыра папрасілі выканаць «Я разумею…» і якая фантастычная цішыня была ў гэты момант у глядзельнай зале…

Узяць з сабою песню

Ніл Сымонавіч Гілевіч — сапраўдны класік беларускай літаратуры.

Ад яго разбягаліся хвалі ўпэўненасці і непахіснасці. Ён як той велічны дуб, што стаіць на ўзлеску нашай беларускасці. Але пад суровай знешнасцю хавалася жывое і па-юнацку гарачае адчуванне жыцця. І гэта адчуванне не можа не класціся ў радкі непаўторных, мілагучных вершаў. І было б дзіўна, калі б з гэтых вершаў не нараджаліся песні. І мяне не абмінула гэтая юдоль — больш за дваццаць песень у нашай агульнай скарбонцы.

Аднойчы я прывёз Нілу Сымонавічу новыя песні на яго вершы. Ён уважліва іх праслухаў і павярнуўся да мяне: «Вы ведаеце, існуе восем варыянтаў мелодыі на мой верш «Край мой беларускі…». І ваш варыянт, дзявяты па ліку, мне падабаецца больш за астатнія». Шчыра скажу: было прыемна пачуць гэта. А яшчэ прыемней адчуваць дыханне і водгук глядзельнай залы, калі яна разам з табой спявае гілевіцкае бессмяротнае:

Калі ж над Радзімай прамчацца вятры —
Прадвеснікі блізкага бою, —
З вінтоўкай, з гранатаю разам, сябры,
Песню бярыце з сабою!..

І мы абавязкова возьмем з сабой у сваю светлую будучыню Песню гэтага цудоўнага чалавека.

Падарунак

Беларускі тэлевізійны канал ОНТ добра ведаў, калі ў народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча дзень нараджэння. Здаецца, напярэдадні там доўга думалі — а што б такога падарыць шаноўнаму Нілу Сымонавічу? І ўрэшце вырашылі паказаць 30 верасня канцэрт легендарнага італьянскага кампазітара і спевака Тото Кутуньо, які адбыўся 22 верасня ў Віцебску. І некалькі дзён тэлевізія рабіла анонс, дзе ў выкананні сівагаловага італьянца амаль без акцэнту гучала бессмяротнае: «А я лягу-прылягу…». Паколькі словы гэтай песні напісаў Ніл Гілевіч, то і атрымаўся прыемны падарунак не толькі паэту, але і ўсім беларусам.

Раніцай 30 верасня я патэлефанаваў Нілу Сымонавічу і павіншаваў з днём нараджэння. Запытаўся:

— Ніл Сымонавіч, тут ОНТ Вам падарунак падрыхтавала. Ці ведаеце?

— Ведаю, мне ўжо тэлефанавалі. Як быццам спецыяльна да дня нараджэння!

— А то ж !..

— Калі гэта спраўдзіцца, і такі вядомы чалавек праспявае маю песню, то гэта будзе цудоўна!..

Спраўдзілася: напрыканцы вельмі добрага канцэрта маэстра Кутуньо абвесціў, што ўсю ноч рыхтаваў падарунак беларускім слухачам, і цяпер праспявае песню, якая яму вельмі падабаецца. Паставіў перад сабой сшытак, дзе вялікімі лацінскімі літарамі былі напісаны словы, і пачаў: «Вы шуміце, шуміце нада мною бярозы…». І вялікая зала віцебскага канцэртнага амфітэатра, і ўся Беларусь дружна падпявалі сонечнаму італьянцу — бо няможна быць маўклілівым, калі гучаць такія словы…

Братка Пісьмянок

Упершыню з Алесем Пісьмянковым мы сустрэліся 26 лістапада 2001 года ў Оршы — на вечарыне паэта Паўла Саковіча. Алесь з цікавасцю паслухаў мае песні, выцягнуў з кішэні невялічкі буклет і падпісаў: «Міколу Яцкову — невыпадкова». Так яно і сталася: выпадковая сустрэча зрабілася невыпадковасцю ў нашых лёсах. Бо з гэтага падоранага буклета вылецелі песні, якія адразу пачалі жыць сваім, самастойным і своеасаблівым, жыццём. Помню, я спытаў у Алеся, калі ён упершыню іх пачуў: «Ну, як табе песні?». І пачуў у адказ: «Слухаў і плакаў». Асабліва добра паклалася яму на сэрца «Лазня», і калі мы часам сустракаліся, казаў: «Ну, усё, Мікола, вось збяромся і паедзем да мяне на радзіму. Ты ведаеш, як там скачуць пад нашу «Лазню»?! Ого-го!». Але, на жаль, не сабраліся, не паехалі…

Апошняя наша сустрэча адбылася ў мінскім Чырвоным касцёле 23 сакавіка 2004 года, на вечарыне Міколы Шабовіча. Алесь быў нейкі не такі, як звычайна, — сцішанасць, адхіленасць ад усяго віхурылася над ягонай постаццю. Ён быў тут, з намі, але як быццам яго тут не было. І ніхто нават не мог і падумаць, што роўна праз месяц, 23 красавіка, ён нас назаўсёды пакіне…

А калі чорнай маланкай палыхнула страшная вестка, прыйшлі радкі, пакладліся і на паперу, і на сэрца:

…Плачуць берагі
Бесядзі Тваёй.
У сівой тугі —
Залаты спакой.
І ў світанак зноў
Твой плыве вянок…
Светлых Табе сноў,
Братка Пісьмянок!

Ён пайшоў, але застаўся. І пісьмянкоўскае традыцыйнае развітальнае «Не знікай!» заўсёды будзе асвятляць і саграваць.

Жыццё пражыць — нібыта скласці песню

Калі тэлефаную ў Мінск Сяргею Іванавічу Законнікаву, ведаю, што абавязкова пачую: «Здароў, Міколка! Як твае справы?». І адразу на сэрцы робіцца добра і светла. І такое ж святло ідзе ад вершаў гэтага цудоўнага чалавека, для якога галоўнае ў жыцці — Айчына. Усё сваё свядомае жыццё Сяргей Законнікаў працаваў дзеля таго, каб Беларусь заўсёды была квітнеючай і моцнай, каб беларускае Слова аздабляла нашу штодзённасць. І Айчына ўшанавала свайго руплаўца ўзнагародамі, сярод якіх зіхаціць Дзяржаўная прэмія па літаратуры імя Янкі Купалы — найвышэйшая для кожнага беларускага літаратара.

Змяніліся часы, накірункі і прыярытэты. Але не змяніўся Законнікаў. Бо мова, народ і Айчына для яго — паняцці нязменныя і святыя, якія абавязкова перажывуць усе нягоды. Як гэта заўсёды было на нашай шматпакутнай беларускай зямлі…

У Законнікава спеўная душа. І я гэта заўсёды адчуваю, — і вось ужо дваццаць песень на яго вершы нарадзіліся ад гэтага адчування.

Законнікаў — як подых вялікай беларускай гісторыі. Калі ты побач з ім, то ўзнікае пачуццё, што гэты чалавек жыў у тыя далёкія часы, бачыў і помніць усё. І аднойчы ў мяне нарадзіліся вось гэтыя радкі:

Хто Грунвальдскіх бачыў
коннікаў?
Вядома ж — Сяргей Законнікаў!

Праўду кажуць, што прозвішча накіроўвае лёс. Законнікаў — гэта закон праўды, нязломнасці і мудрасці. Вельмі патрэбны для нас закон.

Нязменны

Уладзімір Пракопавіч Някляеў — колькі яго памятаю — заўсёды вызначаўся праўдашукальніцтвам. Ён ніколі не хлусіў ні сабе, ні іншым, і казаць праўду для яго было як дыхаць.

Упершыню нашы шляхі сустрэліся ў 1979 годзе, калі я вучыўся ў Мінску і пачынаў займацца паэзіяй, а ён, ужо вядомы паэт, працаваў на пасадзе літаратурнага кансультанта газеты «Знамя юности». Некалькі сваіх вершаваных опусаў я даслаў у рэдакцыю і атрымаў на іх два адказы ад Уладзіміра Някляева, у якіх ён шчыра і па-сяброўску строга паказаў мне на ўсе недарэчнасці маіх твораў. І тая ягоная праўда, шчыра кажучы, дапамагла па-іншаму зірнуць на напісанае і дазволіла зразумець, што для дасягнення станоўчых вынікаў трэба ўпарта і самааддана працаваць.

Някляеў кажа ўсім нам: «Давайце жыць па праўдзе — і ўсё ў нас атрымаецца!»

Такі вось ён — светлы і нязменны.

Не перайсці межы,
або Рэфлексіі з нагоды адной новай кнігі

Мікола ГІЛЕВІЧ

Уладзімір Сіўчыкаў. Пацалаваць Фідэля. — Мінск: Выдавец Уладзімір Сіўчыкаў, 2020. — 220 с.: іл.



Жанр фацэцыі — сёння дужа папулярны. Калі пацікавіцца этымалогіяй, гэта — жарт, вясёлы анекдот, а адна з першых італьянскіх facetia была пра тое, як італьянец цягнуў сабе спагеціну ў рот, але так загледзеўся на прыгожую італьянку, што не данёс спагеціну да рота, упусціў набраны відэлец і ашпарыў усе сваё прычындалы...

Facebook — наймяккая глеба для аматараў фацэцый. Тут можна бясконца гуляць са сваім сабакам, смакаваць сэксуальныя любошчы, гартаць сямейныя альбомы.

Вы ніколі не задумваліся над пытаннем: чаму дзённікі савецкіх пісьменнікаў адкрываліся толькі пасля іх смерці? Баяліся цэнзуры пасля 70–80-ці гадоў? Глупства. Баяліся жонак, падманных сяброў? Яшчэ большае глупства. Прычына адна — мяжа. Часам яны пераходзілі межы і самі сябе саромеліся.

Мяжа паміж тым, што падумаў, і тым, што сказаў.

Мяжа паміж тым, што сказаў, і тым, што напісаў.

Мяжа паміж тым, што напісаў, і тым... як жыць будзеш.

А далей — мяжа паміж табой і тваімі сябрамі, мяжа паміж табой і Радзімай, паміж табой і тваёй каханай, паміж табой і светам, у якім ты жывеш.

У гэтым сэнсе вельмі парадавала кніжка Уладзіміра Сіўчыкава «Пацалаваць Фідэля», якая надоечы пабачыла свет. Не думаю, што памылюся: у сваіх фацэцыях ён кіраваўся найперш трыма запаведзямі: не нахлусі, не абразь, не прыўкрась.

Сотні людзей у яго фокусе. Сотні рэчаў у яго аб'ектыве. І якіх людзей! І якіх рэчаў...

Але што найбольш цікавіць пісьменніка насамрэч? Рэчы ці людзі? Тое, як рэчы пераўтвараюцца ў людзей? Або тое, як людзі арэчаўляюцца? Або тое, як адны рэчы пераўтвараюцца ў іншыя рэчы, а адны людзі ператвараюцца ў іншых людзей? Або колазварот «людзі-рэчы» незваротны — дадзены нам як нешта пэўнае і вечнае?

Вось Уладзімір Караткевіч стаіць у чарзе на піва:

«Падышла да яго маладая цыганка дый прапанавала паваражыць, але аўтар аповесці «Цыганскі кароль» і апавядання «Краіна Цыганія» быў не ў гуморы:

— Адчапіся. І без цябе моташна!

— Дарма ўпарцішся! Лепей пазалаці ручку — што было і што будзе, скажу, — настойвала цыганка. — Завуць мяне Аза, а цябе Уладзімірам, і чалавек, ты, бачу, вельмі таленавіты...

Заінтрыгаваны, Уладзімір Сямёнавіч выцягнуў з кішэні і падаў «траячку», а варажбітка стала вадзіць пальцам па ягонай далоні.

— Прозвішча тваё — Даугалевіч. Ці не... Караткевіч. І ты знакаміты пісьменнік.

Развітаўся Уладзімір Сямёнавіч з чарговай купюрай і толькі наважыўся быў спытацца пра сваю будучыню, як угледзеў непадалёк за газетным кіёскам свайго сябра, навукоўца ды літаратара Адама Мальдзіса, які аж заходзіўся, душыўся ад смеху.

— Ну і паскуднік жа ты, Адаська! — роспачна ўскрыкнуў Уладзімір Сямёнавіч. — Хай жа цяперака не я, а твая падасланая цыганка і півам, і гарэлкай цябе частуе!».

Вось нечаканыя назіранні за МЕТ: «У Метраполітэн-музеі амаль што немагчыма падступіцца да ўзятага пад таўшчэзны паралелепіпед палатна. Гэта — адзін з 36-ці вядомых аўтапартрэтаў Вінцэнта Ван Гога, невядомае «сэлфі» рудавалосага галандца ў яго позняй, надзвычай экспрэсіўнай, пастознай жывапіснай манеры. Менавіта перад ім гіды прамаўляюць найбольш разгорнутыя аповеды...».

Цытаваць кнігу Уладзіміра Сіўчыкава можна было б больш і больш. Гэта такая суцэльная пастоза, сатканая з яго амерыканскіх, беларускіх і адвечных згадак.

Але ў нейкі момант для мяне надышоў момант ісціны. Яго радкі з «Турэцкай падзякі»:

«Напачатку прайшла панарама салона, дзе пасажыры ўладкоўваюцца ў сваіх крэслах, а то і спрабуюць задрамаць, бесклапотна пазіраюць у ілюмінатары, адзвоньваюцца родным і блізкім па айфонах...

На наступным плане ў пілоцкай кабіне камандзір паветранага судна прадстаўляе свой экіпаж, робіць звыклыя абвесткі пра меркаваны рэйс — час у паветры, вышыню палёту, адлегласць да аэрапорта прызначэння. Але наапошку ён нечаканa абвяшчае, што на борце сярод іншых пасажыраў знаходзіцца ягоны школьны настаўнік, якому ён хацеў бы выказаць сваю бясконцую ўдзячнасць і невымерную павагу.

Камера ў салоне выхоплівае буйным планам расчуленага сямідзесяцігадовага, інтэлігентнага выгляду мужчыну ў кардыгане і пад гальштукам. На твары ягоным прачытваецца скрайняе ўзрушэнне, на вачах наварочваюцца слёзы, якія ён намагаецца ўпотай змахнуць насоўкай...

Па праходзе паміж крэсламі да яго прастуюць з агромністым букетам кармазынавых ружаў дзве красуні-сцюардэсы, а следам за імі — два малойцы-сцюарды. Яны дораць кветкі, па чарзе цалуюць настаўніку-ветэрану руку, потым дакранаюцца да яе лбом на знак пашаны, а тады яшчэ цалуюць настаўніка ў шчаку.

Напачатку знямелыя, а потым здзіваваныя і ўзрушаныя пасажыры наладжваюць авацыю. А калі з кабіны выходзіць камандзір карабля, цалуе і абдымае свайго колішняга настаўніка і зноў дзякуе яму, дык шмат хто з прысутных жанчын не можа прыхаваць ужо свае слёзы...

Сюжэт выйшаў папраўдзе вельмі кранальны і паказаў выключную павагу да настаўнікаў, якія шмат у чым фармуюць жыцці і лёсы».

Дзе заканчваюцца рэчы? І дзе пачынаюцца людзі? Дзе яны ніколі і не пачыналіся і не заканчваліся?

Сваёй кніжкай «Пацалаваць Фідэля» Уладзімір Сіўчыкаў гаворыць, што няма такіх рэчаў і людзей.

Кніжка «Пацалаваць Фідэля» ўлюбляе. Дзе-нідзе нават закалыхвае і люляе ў салодкім сне пра шчаслівую Амерыку, пра бел-чырвона-белую Беларусь. Гэта ўдалося аўтару. Бо ён не перайшоў межы. Бо ён застаўся шчырым. І нікога не абразіў. Захаваў дыстанцыю.

...У крамах намалявалі жоўтыя лініі перад касамі. Да найбліжэйшага табе чалавека — паўтара метра.

Дыстанцыя.

Каб перадаць кнігу.

Пацалаваць Фідэля.

Нататкі на добры настрой

Алеся ЛАПІЦКАЯ

Кніга Уладзіміра Сіўчыкава «Пацалаваць Фідэля» з нататкамі, показкамі ды анекдотамі — чарговая нагода ўзгадаць, які цудоўны свет мы страцілі на пачатку 2020 года. Шматлюдныя святы, сяброўскія сустрэчы, літпрэзентацыі, агляд музейных экспазіцый — усё гэта раптам знікла з нашай штодзённасці. Нават пасядзець у кавярні ці з лёгкім сэрцам пайсці на выпускную вечарыну наважыцца далёка не кожны.

А колькі было файнага ў ранейшым жыцці!.. Тым не менш, шмат з таго, што апісана ў кнізе, такі засталося з намі. Кожны ахвочы можа зазірнуць у Сад камянёў ці прайсціся па Вайсковых могілках у Мінску, пастаяць ля помніка Льву Сапегу ў Лепелі, наведаць касцёл Маці Божай Ружанцовай і Святога Дамініка ў Ракаве. Новая кніга пісьменніка і выдаўца натхняе стварацы і ўдакладняць сваю «магічную мапу» Беларусі. А вось далёкія вандроўкі пакуль даводзіцца адкладаць — хаця чаму б не падрыхтавацца да іх, улічваючы досвед аўтара?

Уладзімір Сіўчыкаў апісвае выдатныя мясціны, якія варта абавязкова наведаць у ЗША, узнаўляе гісторыю знакамітай статуі Свабоды, папярэджвае махляроў пра асаблівасці тамтэйшага справаводства і нават выкрывае памылкі Маякоўскага. Не менш зацікаўлена ён піша пра Грузію ды Італію. Багата ў кнізе і цікавостак пра Беларусь — так, у самым пачатку згадваецца загадкавае паселішча Рай, якое ў сярэдзіне XIX стагоддзя знаходзілася на месцы сучаснага Парка Чалюскінцаў у Мінску. З дзясятак адметных і вельмі нават сучасных мясцін можна пабачыць на фотаздымках, што ілюструюць выданне.

Але ў першую чаргу кніга Уладзіміра Сіўчыкава, вядома, прысвечана культурнаму жыццю Беларусі. Тут і цікавыя здарэнні з вядомымі асобамі, і згадкі пра выдавецкія праекты, і гісторыі з'яўлення тых ці іншых твораў — напрыклад, містычны расповед пра два «Смаленні вепрука». Будучым культуролагам ды гісторыкам літаратуры гэтае выданне будзе вельмі карысным.

Нататкі з нізкі «Уладзевы гісторыі» вельмі разнастайныя ў эмацыянальным плане. Побач з нетаропкімі развагамі сустракаюцца крывавыя блокбастэры, побач з анекдотамі — настальгічныя ўспаміны. Аўтар — назіральны, дасціпны, іранічны — ахвотна падзеліцца не толькі ўражаннямі, але і канкрэтнымі фактамі. Да прыкладу — гісторыя пра помнік Янку Купалу скульптара Анатоля Анікейчыка, які паводле інфармацыі з энцыклапедыі ўсталяваны ў горадзе Нью-Ёрк. Але насамрэч помнік знаходзіцца на поўначы аднайменнага штату ля гарадка Хэрыман. Чаму менавіта тут — спадзяемся дазнацца з наступнага зборніка прозы!

Выдатна, што пісьменнік здатны заўважаць вясёлае, пазітыўнае, натхняльнае. У кнізе знойдзецца нямала ўзнёслых, захопленых расповедаў, якія вяртаюць суладдзе і надаюць бадзёрасці. Гэта і нататкі пра мінулае горада Жодзіна, дзе нарадзіўся Уладзімір Сіўчыкаў, і ўспаміны пра свята ў магдэбургскім горадзе Ракаве. А самым цікавым для многіх чытачоў, магчыма, будзе нарыс «Падымі мяне ў светлы абшар» — пра падарожжа на паветраным шары фірмы «Аэратур Балунс», здзейсненае самім аўтарам. Шмат хто паглядаў знізу на паветраныя шары летнімі вечарамі, але як палёт праходзіць для пасажыраў? Хто прыдумаў першы паветраны шар? Якой была гісторыя паветраплавання ў Рэчы Паспалітай? Пра ўсё гэта можна даведацца з дасціпнага нарыса, які завяршае кніга.

«Піша Сіўчыкаў проста і шчыра, але з драйвам і здаровай эмоцыяй, цвярозай іроніяй і гумарам», — зазначаў Леанід Галубовіч. Аўтарскі стыль застаецца нязменным — таму кніга «Пацалаваць Фідэля» выдатна пасуе для чытання ўлетку, паміж гра́дамі і шашлыком. Што да дзіўнай назвы, то хай яна будзе інтрыгай. Спадар Уладзімір далёкі ад таго, каб услаўляць важака кубінскай рэвалюцыі, але заўсёды знойдзе вясёлую показку на добры настрой!

Сузор'е слынных мастакоў

Таленты нараджаюцца і ў самыя неспрыяльныя для народа часы. XIX стагоддзе дало нашаму краю цэлае сузор'е мастакоў, якія здабылі славу на роднай зямлі і ў свеце. Гэтыя творцы глыбока перажывалі паняволенае становішча Айчыны, ператворанай у расейскую калонію. Шмат хто з іх браў удзел у таемных патрыятычных таварыствах. Калі разгараліся вызвольныя паўстанні, мастакі мянялі пэндзлі і алоўкі на стрэльбы і шаблі, за што ўлады разлічваліся з імі турэмным зняволеннем і высылкамі ў Сібір. Многія майстры змушаныя былі ад'язджаць на доўгія гады ў замежжа, аднак і там натхняліся ўспамінамі пра далёкую радзіму.

Творчая спадчына гэтых мастакоў сёння ў музеях і галерэях розных краін. Але найперш дарагая яна нам, бо сваёй працаю творцы сцвярджалі: беларусы — адметны народ з уласнай гісторыяй, мовай ды традыцыямі.

Уладзімір АРЛОЎ

Смуглевіч і Рустэм

У Віленскім універсітэце, пакуль яго не зачынілі ўлады, дзейнічаў факультэт літаратуры і прыгожых мастацтваў. Найярчэй між выкладчыкаў-мастакоў на пачатку XIX стагоддзя ззялі таленты прафесараў Францішка Смуглевіча і Яна Рустэма.

Смуглевіч набыў мастацкую адукацыю ў Рымскай акадэміі святога Лукі, якой удзячныя многія еўрапейскія майстры. У Вільні ён заснаваў катэдру жывапісу і малюнка. Вучні захапляліся акварэлямі прафесара, дзе ён адлюстраваў архітэктурныя помнікі былой сталіцы. На ягоных размалёўках універсітэцкіх залаў ажывалі старажытныя філосафы і пісьменнікі Сакрат, Арыстоцель, Платон, Дыяген, Гамер, Эўрыпід. Карціны і фрэскі Смуглевіча аздаблялі шматлікія храмы ў Менску, Горадні, Полацку, Рэчыцы. Вялікі цыкл твораў мастака на рэлігійныя тэмы ўпрыгожвае віленскі Катэдральны сабор святых Станіслава і Уладзіслава.

Шырока вядомыя гістарычныя творы Францішка Смуглевіча, асабліва «Прысяга Касцюшкі на Кракаўскім рынку». Як выглядалі простыя ліцьвіны, можна ўявіць, разглядаючы карціны мастака, прысвечаныя народнаму жыццю.

Паслядоўнікам Смуглевіча стаў Ян Рустэм. Ён вучыўся ў Польшчы і Нямеччыне, затым быў мастаком у прыватным тэатры Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме. Пераехаўшы ў Вільню, Рустэм праектаваў дэкарацыі і касцюмы для гарадскога тэатра. Але галоўнай ягонай справаю стала кіраванне створанай пры ўніверсітэце Віленскай мастацкай школай.

Ян Рустэм праславіўся партрэтамі філамата Тамаша Зана, гісторыка Яўхіма Лялевеля, рэктара Віленскага ўніверсітэта Яна Снядэцкага... У 1820 годзе наладзіў першую ў Літве-Беларусі выставу выяўленчага мастацтва.

Аляшкевіч і Дамель

Гэтыя мастакі сталі ўдзячнымі вучнямі Смуглевіча і Рустэма.

Язэп Аляшкевіч закончыў мастацкі факультэт і дасканаліў майстэрства ў Дрэздэне і Парыжы. У французскай сталіцы ён вучыўся ў славутых жывапісцаў Давіда і Энгра. Сваім сябрам Аляшкевіча абрала Акадэмія мастацтваў у Пецярбурзе. Жывучы ў сталіцы імперыі, ён меў шмат замоваў, ды ніколі не парываў сувязі з Айчынай.

Аляшкевіч часта і надоўга выязджаў у беларускія губерні. Спыняючыся ў маёнтках прыяцеляў, ён абавязкова маляваў партрэты гаспадароў. На жаль, амаль усе тыя творы, раскіданыя па шляхецкіх сядзібах, загінулі. Да нас, на шчасце, дайшлі партрэты кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага, палітыка Адама Чартарыйскага, вучонага Марціна Пачобута-Адляніцкага. У Пецярбурзе Аляшкевіч часта сустракаўся з Адамам Міцкевічам і намаляваў яго цудоўны партрэт, на якім паэт паказаны ў хвіліны творчага роздуму.

Сучаснік Аляшкевіча Ян Дамель ствараў карціны пераважна на гістарычныя тэмы: «Смерць магістра крыжакоў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам», «Павел I вызваляе Касцюшку з вязніцы», «Адступленне войскаў Напалеона праз Вільню», «Пераправа французаў праз Бярэзіну». Мастацкі вышыняў Дамель дасягнуў і ў сваіх партрэтах — аднаго з кіраўнікоў вызвольнай барацьбы ў 1794 годзе Тамаша Ваўжэцкага, князя Дамініка Радзівіла, графа Яўхіма Храптовіча, археолага і краязнаўца Канстанціна Тышкевіча.

Мастак меў вясёлы характар, быў чалавекам дасціпным ды таварыскім і здолеў пранесці гэтыя рысы праз усе жыццёвыя выпрабаванні. А іх на долю Яна Дамеля выпала нямала. Ён непазбежна трапіў у няміласць да ўладаў: маляваў партрэты «непажаданых асобаў», выказваў «рамантычныя антырасейскія надзеі», упрыгожваў Вільню да святкавання дня нараджэння Напалеона ў 1812 годзе. Апынуўшыся не па сваёй волі ў Сібіры, Дамель і там не перапыняў творчасці: аздабляў фрэскамі храмы, рабіў замалёўкі абліччаў і побыту мясцовых жыхароў.



Ян Дамель. Аўтапартрэт

Адбыўшы высылку, Ян Дамель стала пасяліўся ў Менску. Мастака часта бачылі то на беразе Свіслачы, то на Залатой Горцы, то проста на вуліцах і плацах. Паўсюль з ім былі алоўкі або алейныя фарбы. Апошні зямны прыстанак майстра — касцёл на менскіх Кальварыйскіх могілках. Над магілай Дамеля замест помніка змясцілі намаляваны ім самім абраз «Маленне Збаўцы». Мастак лічыў яго сваім найдасканалейшым творам.

Скульптар Дмахоўскі-Сандэрс

Не горш, чым у Беларусі, яго ведаюць у Злучаных Штатах Амерыкі.

Генрык Дмахоўскі спасцігаў у Віленскім універсітэце прававыя навукі, ды больш гарнуўся да мастацтва: браў урокі малявання і скульптуры. Здзяйсненне мары стаць мастаком адклалі на будучыню падзеі1831-га. Дваццацігадовы юнак далучыўся да змагароў, а затым, ратуючыся ад пераследу, апынуўся ў Францыі. Генрык падтрымаў планы свайго колішняга камандзіра Язэпа Заліўскага вярнуцца на радзіму і нанова распаліць агонь змагання.

Аднак спроба прабіцца ў родныя мясціны была няўдалай. Генрык патрапіў у аўстрыйскую турму. Сем гадоў зняволення не пайшлі намарна. Вязень-ліцьвін зноў заняўся скульптурай. Вядома, умовы былі зусім не такія, як у Вільні, але ён натхнёна ляпіў фігуркі з хлебнага мякішу. У гэтай справе Дмахоўскі дасягнуў сапраўднай дасканаласці. Яму ўдалося пераправіць свае невялікія турэмныя творы ў Англію, і яны мелі там вялікі поспех на мастацкіх выставах.

На волі Генрык не адмовіўся ад юначай мэты і прайшоў конкурс у Парыжскую школу вытанчаных мастацтваў. Выкладчыкі запрасілі таленавітага студэнта разам з імі стварыць саркафаг Напалеону Банапарту. Дмахоўскі атрымліваў новыя прэстыжныя замовы, аднак ягоная душа, апрача свабоды ў творчасці, прагнула свабоды і ў рэальным жыцці.

У рэвалюцыйным для Еўропы 1848 годзе мастак накіраваўся з Францыі бліжэй да Айчыны. Ён браў удзел у вулічных баях з аўстрыйскімі войскамі падчас Львоўскага паўстання, а потым стварыў мадэль помніка палеглым патрыётам у выглядзе аркі з вострых баявых косаў.

Праз некалькі гадоў у ЗША з'яўляецца скульптар Генры Сандэрс. Пад гэтым імем наш суайчыннік заснаваў папулярную школу-майстэрню. За акіянам ён стварае скульптуру «Гарыбальдзі з баявымі сябрамі», бюсты Тадэвуша Касцюшкі, прэзідэнтаў Джорджа Вашынгтона і Бенджаміна Франкліна, аўтара Дэкларацыі незалежнасці Злучаных Штатаў Амерыкі Томаса Джэферсана. Гэтыя бюсты сёння ўпрыгожваюць будынак Кангрэса ЗША ў Вашынгтоне.

З Айчыны даходзілі чуткі пра падрыхтоўку новага магутнага выступу супроць расейскага прыгнёту. Яны не пакідалі Сандэрса-Дмахоўскага абыякавым, і ў 1861-м ён сеў на карабель, што выпраўляўся ў Еўропу.

У роднай Вільні Генрыку былі наканаваныя ўсяго два гады жыцця і працы ў сваім скульптурным атэльe, што месцілася насупраць Катэдральнага сабора. Для гэтага храма ён выканаў фігуру святога Уладзіслава і мадэль надмагільнага помніка Барбары Радзівіл. Мастака абралі праваздзейным сябрам Віленскай археалагічнай камісіі. Агульную ўхвалу заслужыў ягоны помнік Уладзіславу Сыракомлю.

Ды тут надышоў 1863-ці... Паўстанцкае кіраўніцтва накіравала Генрыка Дмахоўскага ў родныя мясціны — камісарам Дзісенскага павета. У траўні на ягоны аддзел раптоўна напалі карнікі. «Дмахоўскі, васьмю кулямі прашыты, упаў на рукі моладзі», — напісаў у лісце адзін з падначаленых героя. Пахавалы скульптар-ваяр у лесе каля вёскі Бірулі Докшыцкага раёна.

На радзіме героя, у вёсцы Забалоцце Мёрскага раёна, захаваўся старасвецкі парк з дубамі, якія памятаюць Генрыка. Сядзібны дом Дмахоўскіх не ацалеў. На яго падмурку цяпер клуб і бібліятэка, дзе ёсць мемарыяльны куток, прысвечаны сусветна вядомаму земляку.

Найлепшы партрэтыст сталіцы

Беларускае мастацтва XIX стагоддзя немагчыма ўявіць без Валянціна Ваньковіча.

Ягонае дзяцінства прайшло ў бацькавым маёнтку Малая Слядянка пад Менскам. Малявац хлопчык пачаў надзвычай рана, яшчэ не ўмеючы чытаць і пісаць. На малюнках, што з'яўляліся ў альбомах, нататніках, а часам проста на вокладках кніг, былі дрэвы і будынкі, звяры і птушкі, фантастычныя стварэнні, падказаныя дзіцячым уяўленнем. У адзінаццаць гадоў бацькі завезлі Валянціна ў Полацкі езуіцкі калегіюм, што неўзабаве стаў Акадэміяй.

Полацак у гэты час лічыўся другім пасля Вільні мастацкім цэнтрам Беларусі. Малявальныя класы калегіюма былі па-еўрапейску абсталяваныя ўсімі неабходнымі мадэлямі, атласамі, падручнікамі. Карцінная галерэя Акадэміі з творамі еўрапейскіх майстроў так уразіла юнага шкаляра, што ён напісаў у лісце дадому: «Абавязкова буду мастаком!».

Таямніцы абранай справы юнак спасцігаў у Віленскім універсітэце. Ян Рустэм дазволіў Валянціну, як самаму здольнаму вучню, малявац у сваёй прафесарскай майстэрні. Ваньковіч грунтоўна ведаў айчынную гісторыю, наведваў заняткі на фізічным факультэце, дзе вывучаў законы оптыкі і распаўсюджання святла.

Ваньковічу перадусім падабалася ствараць партрэты. У Вільні ён маляваў духоўна блізкіх яму людзей — філаматаў і філарэтаў Адама Міцкевіча, Францішка Малеўскага, Антона Адынца. Рада ўніверсітэта накіравала Валянціна ў Пецярбургскую Акадэмію мастацтваў. Там праз некалькі месяцаў яго малюнкі адзначылі двума срэбнымі медалямі. За дыпломную працу Валянціну прысудзілі залаты медаль і права на замежную творчую стажыроўку. Ды спадзяванні ўбачыць Італію і яе найбагацейшыя карцінныя галерэі былі перакрэсленыя царскімі чыноўнікамі. Мастаку прыпомнілі сувязі з віленскімі нелегальнымі таварыствамі.

Між тым Ваньковіч невярагодна хутка заваяваў славу самага лепшага пецярбургскага партрэтыста. Напэўна, вам даводзілася бачыць адзін з самых знакамітых партрэтаў — «Адам Міцкевіч на скале Аю-Даг». Пра яго пісалі: «З выявы б'е дзівоснае падабенства. Нельга ўбачыць нічога больш дасканалага». Сам Міцкевіч так упадабаў партрэт, што адразу замовіў тры копіі. Захапленне калегаў і аматараў мастацтва выклікалі і створаныя Ваньковічам партрэты піяністкі Марыі Шымакоўскай, філосафа Андрэя Тавянскага, паэта Аляксандра Пушкіна.

Мастак не стаў затрымлівацца ў імперскай сталіцы. Ягонай чулай душы нязмерна бліжэй быў родны губернскі Менск.

Працяг на стар. 18 (12) »

« Працяг.
Пачатак на стар. 17 (11)

Тут ён жыў то ў сваім прыгарадным маёнтку, то ў брата Эдварда, дзе цяпер створаны Дом-музей Ваньковічаў. Валянцін часта сустракаўся з Янам Дамелем, Вінцэнтам Дуніным-Марцінкевічам, Станіславам Манюшкам. У менскі перыяд жыцця Валянцін звярнуўся да гісторыі і стварыў цыкл карцін, прысвечаных Напалеону. А для карціны «Мадонна з дзіцем» мастаку пазіравала простая беларуская сялянка.

Рэшту жыцця Ванькoвіч правёў у вандроўцы па Еўропе. Яна завяршылася ў Парыжы, дзе Валянцін пасяліўся ў доме даўняга сябра Адама Міцкевіча. Геніяльны паэт да астатніх хвілін не пакідаў хворага мастака. Яго пахавалі на парыжскіх могілках Манмартр-дэ-Сэн-Дэні.

Апошняя карціна Валянціна Ваньковіча «Маці Божая Вастрабрамская» упрыгожвае алтар парыжскага касцёла святога Севярына. «Мадонна з дзіцем» — у найбагацейшым музеі Францыі Луўры. Творы майстра сёння таксама ў карцінных галерэях Вільні, Варшавы, Кракава, Пецярбурга. Яны вяртаюцца і на радзіму мастака. Помнік творцу сустрэне вас каля ўваходу ў менскі Дом-музей Ваньковічаў. Мастак і тут неразлучны з палітрай і пэндзлем.

Напалеон Орда

Будучага мастака назвалі ў гонар Напалеона Банапарта, з якім патрыёты Вялікага Княства звязвалі надзеі на аднаўленне незалежнасці. Першай настаўніцай хлопчыка стала маці Юзафіна. Яна была здольнай піяністкаю і марыла, што сына чакае лёс кампазітара.

Напалеон навучаўся ў Свіслацкай гімназіі ды на фізічным факультэце Віленскага ўніверсітэта. Каланіяльныя ўлады не далі атрымаць дыплом. У 1827 годзе выдатніка Орду адлічылі за сяброўства ў таемным таварыстве «Заране», у якім ён браў удзел яшчэ гімназістам. 15-месяцовае турэмнае зняволенне юнака мела працяг — адпраўку пад нагляд паліцыі ў бацькаў маёнтак Варацэвічы на Піншчыне.

А ў 1831-м Напалеон далучыўся да тых, хто кінуў выклік каланізатарам. Вызначыўшыся ў баях, стралок коннай гвардыі Напалеон Орда быў адзначаны чынам капітана і найвышэйшай вайсковай узнагародаю — ордэнам «Virtuti Militari». Пасля разгрому паўстання ён амаль чвэрць стагоддзя мусіў жыць за мяжой.

У Парыжы наш зямляк працягваў заняткі музыкай пад кіраўніцтвам польскага кампазітара Фрыдэрыка Шапэна. Орда і сам пісаў творы для фартэпіяна: рамансы, паланэзы, серэнады, мазуркі, стаў дырэктарам парыжскай Італьянскай оперы. Паспяхова займаўся ён у той час і літаратурнай творчасцю, друкуючы нарысы пра вядомых сучаснікаў. У парыжскім асяроддзі Орды былі пісьменнікі Анарэ дэ Бальзак, Стэндаль, Іван Тургенеў, кампазітары Джузэпэ Вэрдзі і Джакіна Расіні.

Але славу Орда заслужыў перадусім як мастак. Ён быў улюбёным вучнем французскага майстра архітэктурнага краявіду П'ера Жэрара. У сваіх летуценнях Напалеон часта вяртаўся ў Літву-Беларусь і бачыў сябе мастаком-вандроўнікам. Летуценні сталіся яваю, калі на пяцідзясятым годзе жыцця ён нарэшце зноў ступіў на зямлю продкаў. У недалёкім часе Орда і распачаў свае знакамітыя падарожжы з алоўкамі, фарбамі і пэндзлем. Ён нястомна маляваў мясціны, звязаныя з жыццём выдатных асобаў, і краявіды з помнікамі беларускай старасвеччыны.

Некалькі сотняў гэтых малюнкаў і акварэляў стварылі велічны і непаўторны вобраз Айчыны ў тую эпоху. На творах Напалеона Орды адлюстраваны Полацак і Вільня, Віцебск і Горадня, Магілёў і Менск, Пінск, Лагойск, Слуцак... Сімваламі слаўнага мінулага паўстаюць Крэўскі, Мірскі, Нясвіжскі, Наваградскі, Лідскі, Медніцкі замкі. Мастак падараваў нам на сваіх акварэлях выявы старадаўніх храмаў: полацкіх Сафійскага сабора і Спаса-Ефрасіннеўскай царквы, гарадзенскай Каложы, касцёлаў у Гнезне і Ішкалдзі. Пранікнёна і з любоўю намаляваў ён родныя мясціны Тадэвуша Рэйтана, Тадэвуша Касцюшкі, Адама Міцкевіча... Пра некаторыя страчаныя гістарычныя помнікі мы ведаем сёння адно дзякуючы творчай спадчыне Орды.

Надзвычай цікавая і загадкавая старонка жыцця Напалеона Орды –паездкі па ахопленым паўстаннем краі ў 1863-м. Магчыма, ён дапамагаў каліноўцам падтрымліваць сувязь. У жандарскіх дакументах сцвярджалася, што мастак займаецца «черчением планов городов». За гэта на яго завялі справу аб пазбаўленні шляхецкіх правоў.

Творы Напалеона Орды сёння выдадзеныя ў шматлікіх альбомах. Яго імем назвалі вуліцы ў Менску, Берасці і Горадні, Пінская дзіцячая мастацкая школа. Малюнкі Орды і ягоны партрэт змяшчаліся на манетах і папяровых грошах незалежнай Беларусі. У вёсцы Варацэвічы, дзе нарадзіўся мастак, створаны ягоны музей-галерэя. Калі апынецеся ў тых мясцінах, не прамініце і цудоўнага помніка, усталяванага творцу ў недалёкім Янаве-Палескім (Іванаве).

Вобразы Міхала Андрыёлі

Бацька Міхала, італьянец Франчэска Андрыёлі, у 1812 годзе адважна ваяваў у Вялікай арміі Напалеона і быў узнагароджаны ордэнам Ганаровага легіёна. Параненым ён патрапіў у палон і ўрэшце асталяваўся ў Вільні, стаўшы мастаком і скульптурам. Малы Міхал уважліва слухаў, калі бацька навучаў маляванню сваіх вучняў.

Хоць Андрыёлі-старэйшы ў будучым бачыў сына доктарам, той вырашыў інакш і ўпэўнена трапіў у лік студэнтаў Маскоўскай вучэльні жывапісу, скульптуры і дойлідства. Працягваў мастацкую адукацыю ён у Рымскай акадэміі святога Лукі. Паўднёвае сонца, насычаныя барвы прыроды, помнікі былых стагоддзяў моцна ўразілі юнака, аднак ён зразумеў, што Італія не заменіць яму Літвы-Беларусі. У сваіх нататках ён прызнаваўся: «Аглядаючы з гары святога Пятра Рым, я неспадзявана засумаваў па Вільні так моцна, што паўсталі ўваччу родныя гаі, пагоркі і пясчаныя сцежкі».


Валянцін Ваньковіч. Партрэт Марыі Шыманоўскай, 1828

Лісты ад сяброў паведамлялі, што ў родным краі неспакойна: сялянскія бунты, хваляванні ў гарадах. У Вільні моладзь выходзіла на маніфестацыі з заклікам: «Прагонім маскалёў!». Міхал Андрыёлі вырашае вярнуцца на радзіму і ранняй вясною 1863 года прысягае на вернасць паўстанню.

Ён змагаўся за свабоду ў аддзеле аднаго з кіраўнікоў вызвольнага руху — Людвіка Нарбута. Падзяляў погляды Каліноўскага і яго паплечнікаў, якія мелі на мэце незалежную будучыню народаў былой Рэчы Паспалітай. Пазней уцёк з царскай турмы, жыў у Лондане і Парыжы.

Уражанні гераічнага 1863-га сталіся асноваю твораў Андрыёлі, што прынеслі яму першае прызнанне. Найлепшая графічная праца гэтага цыклу — «Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў». Невялікі аддзел вядзе няроўны смяротны бой з шматкроць большымі сіламі ворагаў. Поплеч б'юцца шляхцічы і сяляне ў аўчынных кажушках. Цяжка параненага камандзіра падначаленыя на руках выносяць у лес. Нарбута пакідаюць апошнія сілы, іх стае толькі на тое, каб рука не выпусціла пісталет.

Душа мастака бунтавала супроць спакойнага жыцця ў замежжы. Ён кінуў выклік лёсу і перайшоў расейскую мяжу, але апынуўся ў руках жандараў. Андрыёлі на пяць гадоў выслалі ў паўночны горад Вятку. Няўрымслівай натуры Міхала гэтыя гады здаваліся цэлай вечнасцю. Ратавала творчасць і заняткі са здольнымі мясцовымі юнакамі Віктарам і Апалінарыем Васняцовымі. Яны стануць мастакамі і будуць з удзячнасцю згадваць першага настаўніка.

Жыць у беларускіх губернях пасля высылкі Міхалу Андрыёлі было забаронена, і ён пасяліўся ў Варшаве. У той час мастак стварыў ілюстрацыі да паэмаў Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод» і «Пан Тадэвуш», да кніг Уладзіслава Сыракомлі, Язэпа Крашэўскага, Элізы Ажэшкі. З-пад ягонага пэндзля і алоўка выходзяць партрэты Адама Міцкевіча, Тадэвуша Касцюшкі, Яна Снядэцкага, Францішка Багушэвіча, з якім Міхал у 1863-м ваяваў у адным аддзеле. Вабіла мастака і даўняя гісторыя, адлюстраваная на карцінах «Смерць князя Кейстута», «Бітва ліцьвінаў з крыжакамі», «Гусляр», «Хрышчэнне ліцьвінаў».

Да мастака прыйшла еўрапейская слава, і яго запрасілі ў Парыж ілюстраваць кнігі Віктора Гюго, Уільяма Шэкспіра, Аляксандра Дзюма, Ганса Хрысціяна Андэрсана. Усеагульнае захапленне выдаўцоў і чытачоў выклікалі 150 малюнкаў да рамана Фенімора Купера «Апошні з магіканаў». Цяжка было паверыць, што мастак зрабіў іх усяго за чатыры месяцы. Замоваў у Андрыёлі было столькі, што ён адмовіўся, напрыклад, ад ілюстравання «Трох мушкецёраў». Парыжскія газеты часта параўноўвалі нашага суайчынніка са слынным французскім мастаком-графікам Густавам Дарэ. Міхал мог бы застацца ў Парыжы, але яго неадольна цягнула бліжэй да родных лясоў і рэк.

Героямі Міхала Андрыёлі найчасцей былі асобы, надзеленыя шляхетным рыцарскім духам. Па-рыцарску прайшоў жыццёвы шлях і ён сам — італьянец, якога Беларусь зрабіла сваім мастаком.

Альхімовіч і «Пахаванне Гедзіміна»

Казік Альхімовіч вучыўся ў Віленскай гімназіі, дзе вялікую ўвагу надавалі мастацкай адукацыі. У дваццаць два гады ён стаў паўстанцам-каліноўцам і маляваць мог толькі на кароткіх прывалах і ў перапынках паміж баямі. Потым былі шэсць гадоў сібірскай высылкі і забарона жыць на радзіме. Між тым Казімір упарта ішоў да мэты стаць мастаком.

Поспех Альхімовічу падаравала першая ж варшаўская выстава, дзе ён паказаў навеяныя цяжкімі сібірскімі ўспамінамі карціны «Смерць у выгнанні» і «Хаўтуры на Урале». Затым Альхімовіч паступіў у Мюнхенскую Акадэмію мастацтваў. Там творы беларускага жывапісца адзначылі некалькімі залатымі і срэбнымі медалямі. Чатыры гады Казімір працаваў і меў адданых прыхільнікаў у тагачаснай мастацкай сталіцы свету — Парыжы.

Галоўнай тэмаю Казіміра Альхімовіча стала мінулае Літвы-Беларусі, якую ён ведаў не горш за гісторыкаў. Гэта засведчылі карціны «Вешчуны», «Смерць князя Міхала Глінскага ў вязніцы», «Пасля бітвы». Самае значнае гістарычнае палатно майстра — «Пахаванне Гедзіміна». На ім ваяры нясуць забітага крыжакамі вялікага князя. Услед у доўгім белым адзенні ідуць простыя людзі. Для іх гэта таксама велізарная страта. Здаецца, смуткуюць нават вячыстыя дубы і нізкія хмары...

Карціна выстаўлялася на шматлікіх еўрапейскіх і амерыканскіх выставах, здабыла высокія ўзнагароды ў Варшаве, Вене, Львове, Сан-Францыска. Цяпер «Пахаванне Гедзіміна» ў Нацыянальным музеі ў Кракаве.

Казімір Альхімовіч ствараў дзеля будучыні Айчыны. Варшаўскія калегі мастака ўспаміналі, што ён «усёй душой любіў сваю краіну таямнічых бароў, людзей у палатняным адзенні і гаварыў на роднай яму мове».

***

У XIX стагоддзі ў выяўленчым мастацтве плённа працавалі і многія іншыя ліцьвіны-беларусы. Батальныя карціны ствараў Януар Сухадольскі. Майстрам нацюрморта і партрэта стаў Іван Хруцкі. Цудоўна валодаў не толькі жывапісам, але і мастацтвам мазаікі Мікадзім Сіліванові ч, які аздабляў Ісакіеўскі сабор у Пецярбурзе. Наведнікі мастацкіх музеяў сёння захапляюцца краявідамі Апалінара Гараўскага, Генрыка Вейсенгофа і Станіслава Жукоўскага. Адметныя творы пакінулі Канут Русецкі, Язэп Пешка, Міхал Кулеша.

«Беларускім па́нам» любіў называць сябе скульптар і мастак Міхаіл Мікешын. Ён — аўтар помнікаў1000-годдзю Русі ў Ноўгарадзе і Багдану Хмяльніцкаму ў Кіеве. Мікешыну належыць і вялікі цыкл малюнкаў з жыцця землякоў-беларусаў Рослаўскага павета Смаленскай губерні. (Цяпер родная вёска майстра — Максімаўка ў Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласці.)

Насуперак каланіяльнаму ўціску мастакі Літвы-Беларусі выходзілі на новыя творчыя абсягі. Разам з вучонымі і пісьменнікамі яны набліжалі нацыянальнае адраджэнне.

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by